

ШТО ЧАКАЕ ПАКІНУТЫХ У РАДЗІЛЬНІ МАЛЫХ?

Сямейная газета

КНІГІ ЯК ЛЕТАПІСЦЫ ГІСТОРЫІ 14





Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

6 ЛЮТАГА 2020 г. ЧАЦВЕР № 24 (29138)


## ЦЫТАТА ДНЯ



**Дзмітрый КРУТОЙ, першы віцэ-прэм'ер:**

*«У сярэднетэрміновай перспектыве, на гарызонце 2025 года, мы павінны вырашыць маштабную задачу пабудовы IT-краіны. Павінны быць прадметныя, адчувальныя вынікі, якія мы можам паказаць не толькі нашаму грамадству, але і на міжнароднай арэне».*

# КНІЖНАЯ СТАЛІЦА СВЕТУ

## У Мінску праходзіць XXVII Міжнародная кніжная выстаўка-кірмаш «Беларусь — адкрытая кніга»




**Выданні інтэрактыўныя, з малюнкамі, рэдкія, спецыяльныя — новенькія, яшчэ з самым цудоўным у свеце водарам друкарскай фарбы. Трапіць у «БелЭкспа» гэтымі днямі — усё роўна што кніжную шафу разбіраць. Там вока зачэпіцца за радок, тут старонку перагарнеш... Час ляціць, а адарвацца немагчыма. Ад такога багацця хочацца і вось тую прыгожасць з сабой знесці, і гэтую.**

**Што вочы разбягаюцца, не дзіўна, калі ўлічыць, што летась у Беларусі выдадзена амаль дзесяць тысяч назваў кніг і брашур агульным накладам 24 мільёны экзэмпляраў. Больш за васемсот кніг надрукавана на замежных мовах. Пра гэта паведаміў на ўрачыстым адкрыцці выстаўкі-кірмашу міністр інфармацыі Аляксандр КАРЛЮКЕВІЧ.**

**Па традыцыі прывітанне ўдзельнікам і гасцям выстаўкі даслаў Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка. «У нашай краіне стаўленне да кнігі заўсёды было асаблівае: беражлівае і паважлівае. Пытанні захавання і эфектыўнага развіцця выдавецкай галіны і сёння застаюцца ў ліку дзяржаўных прыярытэтаў. Упэўнены, што выстаўка і надалей будзе спрыяць прапагандзе якаснай літаратуры і культуры чытання, паслужыць умацаванню міжнароднага гуманітарнага супрацоўніцтва», — гаворыцца ў лісце, які зачытаў намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Андрэй КУНЦЭВІЧ.**

СТАР. 4




Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

Вольга САЛАЎЁВА з дачкой Эміліяй былі аднымі з першых наведвальнікаў выстаўкі.

## КОРАТКА

• Экспарт беларускай сельгаспрадукцыі ў 2019 годзе перасягнуў $5,5 млрд.

• **Памёр народны артыст Беларусі, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі, акадэмік Міжнароднай акадэміі тэатра рэжысёр Барыс Луцэнка. Спачуванне родным і блізкім накіраваў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка.**



• У Беларусі ў 2019 годзе быў перавыкананы план па будаўніцтве жылля з дзяржпадтрымкай.

• **Студзень гэтага года быў самым цёплым у нашай краіне за ўсю гісторыю метэаназіранняў.**

• Электронны рэгістр выбаршчыкаў запрацуе са з'яўленнем біяметрычных пашпартоў.

• **У Мінску ў найбліжэйшы час не будуць укараняць новую ініцыятыву па кантролі аплаты праезду у наземным грамадскім транспарце — блакаваць валідатары і кампосцеры падчас руху.**

• У Беларусі сярэдняя зарплата будаўніка у 2019 годзе вырасла больш чым на 20 %.

Кузня чэмпіёнаў

# Чарга ў ціры і трэнажоры пасля 22.00

## Фізкультура і спорт у Старых Дарогах. Што ёсць і чаго не хапае гораду

**У 2015-м тут з'явіўся новы фізкультурна-аздараўленчы цэнтр, на плошчы ўсяго 1,5 гектара размясцілася адразу і футбольнае поле, і тэнісны корт, і пляцоўка для пляжнага валейбола. Зімой, калі спрыяе надвор'е, усё гэта пераўтвараецца ў прастору для заняткаў лыжамі і канькамі. Кіруе цэнтрам былы прафесійны спартсмен, які пасля завяршэння гульнявой кар'еры не пабаяўся перабрацца са сталіцы ў раён з насельніцтвам у 19 тысяч, каб працягнуць займацца любімай справай.**

СТАР. 15



Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

ISSN 1990 - 763X

Блізкая ўлада

# БЯСПЕЧНАЕ ПРАЖЫВАННЕ І ПРАЦАЎЛАДКАВАННЕ

**На прыёме грамадзян старшыня Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір КРАЎЦОЎ разгледзеў два пытанні. Кожны зварот быў прадстаўлены ініцыятыўнымі групамі. Адну з іх непакоіў лёс сядзібаў на ўзбярэжжы Нёмана, другая група прадстаўляла інтарэсы асуджаных, якія вяртаюцца з месцаў пазбаўлення волі.**


Фота БелТА.

Жыхароў вуліцы Рабочая, якая знаходзіцца ў абласным цэнтры на правым беразе Нёмана, не задавальняе рашэнне гарвыканкама аб выманні зямельных участкаў і зносе жылых дамоў. Заяўнікі расказалі, што іх дамы знаходзяцца ў добрым стане, гаспадары займаюцца добраўпарадкаваннем, да пабудоў падведзены ўсе патрэбныя камунікацыі, у тым ліку газ. Некалькі гадоў таму значная тэрыторыя вуліцы прыведзена ў парадак мясцовым прадпрыемствам «Зелянбуд», высаджаны дрэвы. Летась адбылася замена электраабсталявання.

І ўсё ж праблема тут існуе. Вуліца, якая складаецца з некалькіх дамоў, знаходзіцца на даволі небяспечным зямельным участку, па якім працякае гарадская рачулка Гараднічанка. Пры ліўнях адбываецца падтапленне дамоў і ўчасткаў. Літаральна нядаўна такім чынам жыхары былі пазбаўлены бетоннага мосціка, які быў пракладзены для пераходу ў цэнтр горада. Гэта выклікала прэтэнзіі з боку жыхароў. Маўляў, трэба гэты мосцік узнавіць.

Згодна з генеральным планам горада, прыбярэжная тэрыторыя, якая знаходзіцца ў гістарычнай частцы горада, будзе не проста добраўпарадкоўвацца, а кардынальна мяняцца. Рэчку Гараднічанку наогул часткова «выпрамяць», каб не ствараць заторы. Адпаведная дакументацыя заказана ў праектным інстытуце.

— Праблемай мы займаемся, гэта гістарычны цэнтр горада, сюды ў першую чаргу наведваюцца турысты, і тэрыторыю трэба добраўпарадкаваць, — патлумачыў Уладзімір Краўцоў. — Частка жыхароў, дамы якіх стаялі ў самай нізіне, адселена. Але гэта не азначае, што заўтра прыйдзе бульдозер і пачне зносіць усё запар. Гэта доўгатэрміновы працэс. Мы пастараемся ўлічваць пажаданні тых, хто там пражывае. Але ўлады павінны думаць і аб небяспецы гараджан. А пражыванне на схілах каля рачулкі і ў межах Нёмана звязана з рызыкай разгула стыхіі.

Пры распрацоўцы праекта дамы, якія стаяць на больш высокіх пляцоўках узбярэжжа, пастараюцца не зносіць. Самі жыхары гатовы ўключыцца ў працэс добраўпарадкавання тэрыторыі і фінансаваць тыя меры перасцярогі, якія будуць патрэбны для ўмацавання схілаў. Таксама жыхары не маюць права нікога рэгістраваць у сваіх дамах. Перад зацверджаннем праекта пройдуць грамадскія абмеркаванні.

З пытаннем працаўладкавання асуджаных, якія вяртаюцца з месцаў пазбаўлення волі, звярнуліся да кіраўніка рэгіёна маці некаторых асуджаных. Па словах заяўніц, пасля вызвалення па амністыі не ўсё добра з работай. Жанчыны пацікавіліся, ці існуюць у рэгіёне квоты на працаўладкаванне і рэабілітацыю такіх людзей.

Як было патлумачана, такія квоты існуюць у кожным рэгіёне. Напрыклад, у Гродзенскай вобласці забраніравана 1200 працоўных месцаў, і гэта лічба таксама можа мяняцца. Пры вызваленні асуджаны павінен звярнуцца ў службу занятасці па месцы жыхарства. Між тым не кожнага задавальняюць прапановы, якія вызначаны па квотах. Але многія, хто вяртаецца з месцаў пазбаўлення волі, страчвае свае былыя навыкі і можа прэтэндаваць у асноўным на нізкакваліфікаваную працу. Каб атрымаць спецыяльнасць, пры цэнтрах занятасці арганізаваны бясплатныя курсы перападрыхтоўкі. Напрыклад, у Гродзенскай вобласці такія курсы ахопліваюць больш за 100 спецыяльнасцяў, якія запатрабаваны на рынку працы. Тым, хто не мае бацькоў, пасля выхаду на волю аказваецца матэрыяльная дапамога. Так, з 29 асуджаных, якія выйшлі па амністыі ўжо сёлета, 11 чалавек працаўладкавана.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Генеральны сакратар ААН заявіў аб аднаўленні эскалацыі ў свеце



«Ад Лівіі, Емена і да Сірыі, і далей — эскалацыя вяртаецца. Зброя паступае. Наступленне расце», — сказаў Антоніу Гутэрыш на прэс-канферэнцыі. Ён адзначыў, што, «нягледзячы на тое, што ўсе сітуацыі адрозніваюцца, ёсць адчуванне павелічэння нестабільнасці і напружанасці». Такія абставіны робяць свет усё больш непрадказальным і некантраляваным, пры гэтым рызыка крытычнай памылкі расце. «Між тым рэзалюцыі Савета Бяспекі парушаюцца яшчэ да таго, як высахне чарніла», — заўважыў генсек ААН.

### ЗША мяркуюць першымі ўсталяваць свой сцяг на Марсе



Прэзідэнт ЗША Дональд Трамп заклікаў Кангрэс цалкам прафінансаваць амерыканскую касмічную праграму Artemis, каб Злучаныя Штаты сталі першай краінай, якая высадзіць жанчынуастранаўта на паверхню Месяца, а таксама ўсталюе свой сцяг на Марсе. Пра гэта амерыканскі лідар заявіў, выступаючы перад сенатам і палатай прадстаўнікоў са штогадовым пасланнем «Аб становішчы краіны». NASA раней абвясціла пра тое, што новая амерыканская праграма асваення Месяца атрымала назву Artemis. Яна будзе складацца з трох этапаў. Першы этап (Artemis 1), які прадугледжвае непілатаваны палёт устаноўленага на ракету SLS (Space Launch System) карабля Orion вакол Месяца і яго вяртанне на Зямлю, запланаваны на другую палову 2020-га. Другі этап (Artemis 2) — аблёт натуральнага спадарожніка Зямлі з экіпажам на борце — намечаны на 2022 год. На трэцім этапе місіі (Artemis 3) NASA разлічвае ажыццявіць высадку астранаўтаў на Месяц у 2024-м і адправіць іх да Марса арыенціровачна ў сярэдзіне 2030-х гадоў.

### У студзені 244 тысячы іспанцаў пазбавіліся работы




Міністэрства працы і сацыяльнага забеспячэння звязвае негатыўную дынаміку з завяршэннем калядных вакацый і, такім чынам, са сканчэннем многіх часовых кантрактаў у сферы турызму і гандлю. Хоць падобныя студзеньскія «правалы» рынку працы — звычайная для Іспаніі рэч цягам апошніх 25 гадоў, цяперашнія паказчыкі найгоршыя з 2014-га. У параўнанні са снежнем колькасць беспрацоўных, афіцыйна зарэгістраваных у нацыянальных цэнтрах занятасці, павялічылася на 2,8 працэнта і ў цэлым склала 3,25 мільёна чалавек. Па гэтым трывожным паказчыку Іспанія займае ў Еўрасаюзе другое месца пасля Грэцыі.

Парламенцкі дзённік

# Да эканомікі ведаў — з чэмпіёнамі свету па падарожжах

Першае пасяджэнне стратэгічнай кансультатыўнай групы Беларусь — Германія адбудзецца на наступным тыдні ў Берліне

**У фармаце кансультатыўнай групы будуць абмяркоўвацца пытанні развіцця двухбаковых адносін. Сярод ключавых сумесных праектаў — эканоміка ведаў, высокія тэхналогіі, энергетыка, экалогія. Стратэгічная група выпрацуе канкрэтныя прапановы для ўрадаў, якія ўвойдуць у дарожную карту развіцця супрацоўніцтва. Плануецца, што гэту задачу яна выканае на працягу 2020—2021 гадоў. Шматлікія сумесныя праекты да 2021 года ўжо будуць рэалізаваныя.**

У Палацы прадстаўнікоў учора адбылася сустрэча **кіраўніка рабочай групы Нацыянальнага сходу Беларусі па супрацоўніцтве з парламентам Германіі Валерыя ВАРАНЕЦКАГА** з парламенцкай дэлегацыяй ФРГ.

Парламенцкае ўзаемадзеянне стварае надзейную аснову для развіцця палітычных адносін, і задача для дэпутатаў у гэтым плане — зрабіць іх сістэмнымі.

Выказалі інтарэс беларускія парламентарыі да развіцця супрацоўніцтва рэгіёнаў (сферы, дзе, на жаль, няма значнага прагрэсу), узаемадзеяння ў інфармацыйнай палітыцы, захаванні агульнай гістарычнай памяці.

**Член Камітэта Бундэстага ФРГ па эканамічных пытаннях і энергетыцы, кіраўнік германска-беларускай парламенцкай групы дружбы Бундэстага Марк ХАЎПТМАН** звярнуў увагу на эканамічнае развіццё, адначыўшы магчымасць пашырэння аб'ёмаў тавараабароту.

Выказаўся ён за нарошчванне культурнага абмену: «У Германіі мала хто ведае пра Беларусь і разбіраецца ў беларускай культуры. Нам давядзецца ўлічваць культурныя аспекты ў нашым супрацоўніцтве, выкарыстоўваць іх для развіцця інтэграцыі і дружбы».

Марк Хаўптман назваў немцаў чэмпіёнамі свету па падарожжах. Ён канстатаваў: «Пры гэтым яны яшчэ не пачалі прыязджаць у вашу краіну. Уявіце, які эфект можна атрымаць!»

**Марыя ДАДАЛКА.**

# ТАРФЯНІКІ ПАД НАГЛЯДАМ

**У выніку буйнамаштабных меліярацыйных работ, праведзеных у мінулым стагоддзі, наша сельская гаспадарка атрымала 900 тысяч гектараў зямель на тарфяных глебах. У адрозненне ад дзярнова-падзолістых глеб, якія пераважаюць па краіне, тарфянікі маюць вышэйшае ўтрыманне арганічнага рэчыва і могуць даваць лепшыя ўраджаі. Але гэтыя землі патрабуюць асаблівай увагі, бо адбываецца здабыча торфу, да таго ж у значнай ступені такія глебы схільныя да эразійных працэсаў. Таму вядзецца пастаянны маніторынг іх стану.**



Упершыню ў краіне вучонымі Інстытута глебазнаўства і аграхіміі НАН Беларусі сумесна са спецыялістамі УП «Праектны інстытут Белгіпразем» створаны навукова-практычны даведнік, які не мае аналагаў на постсавецкай прасторы і ўтрымлівае актуальныя звесткі пра асушаныя і дэгратарфяныя глебы ў складзе сельскагаспадарчых зямель Рэспублікі Беларусь.

Даведнік паказвае распаўсюджанасць тарфяных і дэградаваных земляў па раёнах, абласцях і ў цэлым па рэспубліцы. Ёсць картаграмы дынамікі змен, бо ў якім бы ашчадным рэжыме мы сёння ні выкарыстоўвалі гэтыя землі, натуральнай заработкі торфу не пазбегнуць. Але ад умоў гаспадарання залежыць, наколькі доўга яны будуць служыць.

«Калі ў 2000 годзе ў нас было 190 тысяч гектараў дэградаваных глеб, якія ператварыліся ў тарфяна-мінеральныя, то апошнія даследаванні паказалі, што такіх зямель ужо 313,8 тысячы», — расказвае **намеснік дырэктара Інстытута глебазнаўства і аграхіміі НАН Беларусі па навуковай рабоце, доктар сельскагаспадарчых навук Мікалай ЦЫБУЛЬКА.** Праведзеная вучонымі работа з'яўляецца важнай у плане адсочвання дынамікі змянення ўласцівасцяў гэтых глеб, што дазваляе рэкамендаваць для абласцей, раёнаў, зон сельскай гаспадаркі, дзе асабліва высокая доля тарфяных глеб, карэкціроўку структуры пасяўных плошчаў, размяшчэнне на іх севазваротаў, вырошчванне сельскагаспадарчых культур з высокай глебааbaрончай здольнасцю.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

Беларусь памятае

# ПРАНЕСЦІ ПАМЯЦЬ УЗДОЎЖ МЯЖЫ

**У Брэсцкай крэпасці стартавала міжнародная эстафета, прысвечаная 75-й гадавіне Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне, якая пройдзе па знешняй мяжы краін — удзельніц СНД. Вайскоўцы пранясуць гэты сімвалічны знак уздоўж дзяржаўнай граніцы, пры гэтым зробяць прыпынкі на заставах, у гарадах і сельскай мясцовасці, дзе будуць праведзены мітынгі, сустрэчы. І ўсё для таго, каб напомніць цяперашнім пакаленням пра жахі вайны, каштоўнасць Перамогі, падкрэсліць значнасць урокаў ваенных падзей. І вядома, успомніць герояў, тых, хто загінуў.**



На пачатку ўрачыстага мерапрыемства згадалі воінаў з пагранічных застаў, бо яны былі першыя, хто сустрэўся з ворагам, і першыя, хто загінуў за Радзіму. Значнасць іх подзвігу падкрэсліў у сваім кароткім выступленні **старшыня Дзяржаўнага пагранічнага камітэта Рэспублікі Беларусь Анатоль ЛАПО.**

**Старшыня Брэсцкага аблвыканкама Анатоль ЛІС** нагадаў, што ў ваколіцах Брэста вайну сустрэлі больш за дзве тысячы пагранічнікаў 17-га чырванасцяжнага Брэсцкага пагранічнага атрада. «Многія з іх, на жаль, загінулі. Таму вельмі сімвалічна, што эстафета памяці бярэ пачатак на нашай брэсцкай зямлі, менавіта каля помніка тым вартавым граніцы, якія стаялі да апошняга, — падкрэсліў кіраўнік вобласці. — У крэпасць штогод прыязджаюць сотні, тысячы людзей з многіх краін свету, шмат хто прыходзіць сюды, на месца былых камендатуры і заставы, каб аддаць даніну памяці героям-пагранічнікам».

**Старшыня каардынацыйнай службы Савета камандуючых пагранвойскаў краін СНД Аляксандр МАНІЛАЎ** адзначыў, што эстафета стартуе ў адзін дзень у Брэсце і расійскім Мурманску, а завяршыцца яна 28 мая ў Маскве на Паклоннай гары. Генерал-палкоўнік Манілаў перадаў сімвал акцыі афіцэрам эстафетнай групы, якія паводле загаду генерал-маёра Лапо адразу пачалі рухацца па маршруце ўздоўж беларускай граніцы. Першы прыпынак эстафетнага сімвала запланаваны на 11-й заставе Брэсцкай пагрангрупы імя Героя Савецкага Саюза А. М. Кіжаватава. Ужо 6 лютага эстафету прымуць вайскоўцы з Пінскага пагранатрада, і яна пойдзе далей, на ўсход, уздоўж Лельчыц, Ельска, Мазыра. Прадстаўнікі пагранічнай службы ФСБ Расіі прымуць пераможны сімвал 18 лютага. Кожная перадача будзе суправаджацца мерапрыемствамі з удзелам грамадскасці, моладзі, школьнікаў. Яны і ў крэпасці былі самымі актыўнымі ўдзельнікамі мерапрыемства. Вучні 20-й і 31-й школ Брэста прыйшлі на мітынг з партрэтамі герояў-пагранічнікаў 40-х гадоў.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
**Фота БелТА.**

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

## РАСЦЯГНУЛІ СЕТКІ НА ВОЗЕРЫ НА ПАЎКІЛАМЕТРА

Маштабы промыслу здзівілі нават праваахоўнікаў

**Адкрытая вада, адсутнасць лёду на вадаёмах прыцягваюць браканьераў. За мінулы тыдзень дзяржінспектары аховы жывёльнага і расліннага свету выявілі 40 парушэнняў правілаў рыбалоўства і канфіскавалі больш за сотню сетак агульнай даўжынёй каля 4,5 кіламетра. На шчасце, у большасці выпадкаў парушальнікаў паспелі спыніць яшчэ да таго, як яны нанеслі істотную шкоду прыродзе. Але маштабы аднаго затрымання ўразілі нават праваахоўнікаў, якія шмат чаго бачылі.**



Як паведамілі ў Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, на возеры Чырвоным у Жыткавіцкім раёне двое мясцовых браканьераў расцягнулі паўкіламетровую нізку сетак. Улоў аказаўся на рэдкасць буйны — 230 кілаграмаў рыбы, у асноўным адборны кілаграмовы карась, некалькі шчупакоў і ляшчоў — усяго 249 асобін. Для лоўлі рыбы амаль на прамысловай аснове парушальнікі абсталявалі сваю драўляную лодку маторам. Браканьераў затрымалі супрацоўнікі Гомельскай абласной інспекцыі ў той момант, калі яны выцягвалі сеткі з рыбай з вады.

Шкода, прычыненая прыродзе, склала больш за 8 тысяч рублёў, яна ацэнена як асабліва буйная. Па факце незаконнага рыбалоўства заведзена крымінальная справа. Абодвух браканьераў змясцілі ў ізалятар, ім пагражае штраф і да шасці гадоў пазбаўлення волі.

У Дзяржінспекцыі нагадалі, што хутка ў Беларусі пачнецца чарада веснавых нерастavых забарон на лоўлю рыбы. Паколькі здабыча яе прыладамі з сеткі ў гэты перыяд наносіць прыродзе найбольшую шкоду, таксы для разліку пакрыцця шкоды павялічацца ўтрая. Пакаранне за незаконны вылаў нават невялікай колькасці рыбы істотна ўдарыць па кішэні парушальніка, а браканьерства ў буйных маштабах можа стаць прычынай пазбаўлення волі.

## АЛЕЙ ПАДПАЛІЎ СТОЛЬ

**Увечары ратавальнікам паступіла паведамленне аб задымленні ў кватэры ў Мар'інай Горцы.**

Прыбыўшыя да месца выкліку падраздзяленні МНС устанавілі пах гару ў пад'ездзе і слабае задымленне ў кватэры на пятым паверсе. Гарэнне ў жыллі адсутнічала.

— Напярэдадні здарэння гаспадыня займалася гатаваннем ежы і мыццём посуду. Адбылося загаранне алею ў патэльні. Жанчына, спяшаючыся патушыць, паставіла яе ў мыйку пад вадой, у выніку вогненныя кроплі распырскаліся на нацяжную столь у кухні, якая загарэлася, — паведаміла афіцыйны прадстаўнік Мінскага абласнога ўпраўлення МНС Анастасія Швайбовіч.

Пакідаючы памяшканне, атрымалі тэрмічныя апёкі гаспадыня кватэры (два працэнты паверхні цела) і сын гаспадыні 2008 года нараджэння (11 працэнтаў). Пацярпелыя шпіталізаваны ва ўстанову аховы здароўя.

У выніку пажару агнём пашкоджаны столь і маёмасць на кухні і столь у калідоры.

Ратавальнікі нагадваюць, што, калі загарэўся алей у патэльні (каструлі), ні ў якім разе нельга тушыць яго вадой або любой іншай вадкасцю. Неабходна адключыць канфорку, па магчымасці перакрыць падачу газу або электраэнергіі. Накрыць патэльню або каструлю накрыўкай, пры гэтым выкарыстоўваць прыхваткі, анучы з грубай тканіны, каб абараніць рукі ад агню. Неабходна пакінуць посуд накрытым да астуджэння алею, інакш агонь успыхне зноў.

## РТУЦЬ НА СТАЛІЧНАЙ ЦЭЦ-2

**У Мінскае гарадское ўпраўленне МНС ад начальніка ЦЭЦ-2 паступіла паведамленне аб тым, што пры правядзенні дэмантажных работ на тэрыторыі прадпрыемства разлілася ртуць.**

Да месца выкліку былі накіраваны ратавальнікі, у тым ліку спецыялісты службы хімічнай і радыяцыйнай абароны сталічнага ўпраўлення і рэспубліканскага атрада спецыяльнага прызначэння МНС.

Высветлілася, што ў галоўным корпусе турбіннага аддзялення адбылося выцяканне ртуці з дыферэнцыяльнага ртутнага манометра. Пацярпелых няма, эвакуацыя не праводзілася, тэхналагічны працэс не парушаны.

Работнікі МНС правялі дэмеркурызацыйныя работы, было сабрана чатыры кілаграмы ртуці, яшчэ тры кілаграмы засталося ў дэманціраваным прыборы. Пры дапамозе ртутнага аналізатара былі праведзены замеры наяўнасці выпарэнняў у паветры. Перавышэння гранічна дапушчальнай канцэнтрацыі не выяўлена. Сабраная ртуць змешчана ў палімерную ёмістасць для далейшай утылізацыі.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Не прапусці!

# НОВЫ ФАРМАТ,

## або Як разабрацца ў нюансах тэхнічных прафесій?

**Фестываль навукі і лічбавых тэхналогій DigiPhys 3.0 пройдзе ў ГрДУ імя Янкі Купалы 8 лютага. У першую чаргу ён арыентаваны на школьнікаў і навучэнцаў каледжаў, якім цікавыя фізіка, інфарматыка, электроніка і робататэхніка.**

— Фестываль пройдзе ў абноўленым фармаце, без дакладаў і ўрачыстай часткі. Госці змогуць адразу акунуцца ў атмасферу навукі і тэхналогій, — падкрэслівае **дэкан фізіка-тэхнічнага факультэта Андрэй ГЕРМАН.** — Варта адзначыць, што папярэднія мерапрыемствы наведала больш за тры тысячы гасцей.

Практычная частка фестывалю прадугледжвае больш за 20 займальных дэманстрацый, майстар-класаў і экскурсій ад навукоўцаў і студэнтаў універсітэта, а таксама ад партнёраў фестывалю. Падлеткі змогуць паспрабаваць сябе ў розных IT-прафесіях, напрыклад, у якасці распрацоўшчыка праграмнага забеспячэння або вэб-дызайнера, «навучыць» штучны інтэлект і атрымаць электрычнасць з садавіны і гародніны. Юныя фізікі ўбачаць у рабоце 3D-прынтар, маніпулятар з тэхнічным зрокам, мабільнага робата, лічбавую лабараторыю і іншае ўнікальнае абсталяванне, а таксама паспрабуюць сябе ў ролі інжынера-праграміста і робататэхніка.

Для вучняў выпускных класаў выкладчыкі фізіка-тэхнічнага факультэта правядуць прафарыентацыйныя кансультацыі па тэхнічных прафесіях, раскажуць, які шлях выбраць, каб стаць інжынерам-праграмістам, робататэхнікам, электронікам, энергетыкам або электрамеханікам, а таксама правядуць экскурсіі па ўніверсітэце. Выпускнікі даведаюцца аб такіх сучасных і прэстыжных спецыяльнасцях, як «Камп'ютарная фізіка», «Прамысловыя робаты і робататэхнічныя комплексы», «Інфармацыйна-вымяральная тэхніка».



Гасцей таксама чакаюць мерапрыемствы ад партнёраў фестывалю, дзе ім прапануюць убачыць унікальнае для Гродна абсталяванне і паспрабаваць сябе ў ролі інжынера-робататэхніка, вырабіць электронную паштоўку, наведаць заняткі па робататэхніцы з дэманстрацыяй незвычайных мадэляў робатаў.

Акрамя таго, у рамках DigiPhys адбудзецца абласны этап XI Рэспубліканскага конкурсу навукова-тэхнічнай творчасці навучэнскай моладзі «Тэхнаінтэлект».

Удзел у фестывалі бясплатны, але неабходна прайсці электронную рэгістрацыю і запоўніць форму ўдзельніка па спасылцы: https://ftf.grsu.by.

Удзельнікі таксама могуць далучыцца да групы фізіка-тэхнічнага факультэта ў сацыяльных сетках «УКантакце» і Instagram, дзе будзе размешчана ўся актуальная інфармацыя і фотарэпартаж пра мерапрыемства.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

**Предоставление информации о деятельности Местного фонда «Современная экология» (далее – Фонд)**

В соответствии с п. 46.2 «Положения о создании, деятельности и ликвидации Фондов в Республике Беларусь», утвержденного Указом Президента Республики Беларусь от 01.07.2005 № 302, сообщаем следующее:

1. Местный экологический фонд «Современная экология» продолжает свою деятельность.

1.1. Директор и Совет Фонда располагаются по адресу: 223025, Республика Беларусь, Минская область, Минский район, д. Новое Поле, пер-к 2-й Лесной, д. 1, комн. 84.

2. Информация о количестве учредителей Фонда: 1 (один) учредитель – общество с ограниченной ответственностью «Актуальная экология».

3. Информация о стоимости имущества Фонда:

3.1 стоимость имущества, переданного учредителем Фонда, – 3050,00 бел. руб.;

3.2 поступления от проводимых в 2019 году мероприятий – 0 руб.;

3.3. расходы, понесенные Фондом, – 189,90 руб.;

3.4. доходы от предпринимательской деятельности у Фонда – отсутствуют.

4. Информация об унитарных предприятиях, хозяйственных обществах, созданных Фондом, а также представительствах и филиалах – в 2019 перечисленные предприятия общества представительства и филиалы не создавались Фондом.

Основной целью Фонда было привлечение внимания общества к вопросам экологии, изучение новых технологий в сфере переработки вторичных ресурсов, очистных сооружений посредством участия в семинарах, форумах, зарубежных поездках.

УНП 692010044

# КНІЖНАЯ СТАЛІЦА СВЕТУ




*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Невыпадкова, што менавіта Мінск з'яўляецца пунктам прыцягнення ўсіх, хто ствараe кнігі, бо менавіта з беларускай зямлі дзякуючы Францыску Скарыну, Сімяону Полацкаму пачалася гісторыя выдавецкай дзейнасці. Такое меркаванне выказаў дзяржаўны сакратар Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі Рыгор Рапота. Таксама ён паведаміў, што ў юбілейны год перамогі над фашызмам да выхаду рыхтуецца двухтомнік, прысвечаны Ржэўскай бітве і мемарыялу Савецкага салдата.

Вялікая Перамога ўвогуле стала галоўнай тэмай прамоў на цырымоніі і, адпаведна, асноўным арыенцірам для кнігавыдаўцоў. Наш нацыянальны стэнд прысвечаны акрамя таго Году малой радзімы і 90-годдзю з дня нараджэння Уладзіміра Караткевіча.

Паверараны ў справах Злучаных Штатаў Амерыкі ў Беларусі Джэніфер Мур запрасіла прысутных убачыць Гранд-Каньён, Дыснейлэнд ці Вялікія Смоўкі Маўнцінз. Дыпламат нагадала, што пасольства ЗША ў Мінску ўдзельнічае ў міжнароднай выстаўцы на працягу дваццаці двух гадоў, расказваючы гісторыю Амерыкі. Сёлета ЗША — цэнтральны экспанент Мінскай міжнароднай выстаўкі. Тэмай іх экспазіцыі «У дарозе» сталі кнігі пра падарожжы: даведнікі, падарожнікі, фотанарысы. У павільёне ЗША прадстаўлены настольныя гульні, мастацкія і дакументальныя фільмы і нават сапраўдны дайнер — класічная страўня.

Сёлета Беларусь сустракае кнігавыдаўцоў і пісьменнікаў з трыццаці дзяржаў. Сусветная кніжная прастора ў Мінску прадстаўлена Азербайджанам, Аўстрыяй, Венгрыяй, Вялікабрытаніяй, Германіяй, Індыяй, Іранам, Іспаніяй, Казахстанам, Карэяй, Кітаем, Кыргызстанам, Латвіяй, Літвой, Палесцінай, Польшчай, Румыніяй, Сірыяй, Славакіяй, Таджыкістанам, Туркменістанам, Турцыяй, Узбекістанам, Украінай, Францыяй, Эстоніяй. Ганаровым госцем стала Расія. Усяго ж у выстаўцы ўдзельнічае каля чатырохсот экспанентаў, а падчас форуму запланавана больш за пяцьсот падзей.



Пачатак ім пакладзены ўрачыста: сімвалічную стужку для



адкрыцця выстаўкі перарэзалі Аляксандр КАРЛЮКЕВІЧ, Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Расіі ў Беларусі Дзмітрый МЕЗЕНЦАЎ і Джэніфер МУР. А часткі стужкі сталі сімвалічнымі закладкамі для новых кніг, якія будуць прачытаныя ў 2020 годзе.

Выстаўка-кірмаш прадоўжыцца да 9 лютага. У планах арганізатараў, акрамя экспанавання і продажу кніг (на тое яна і кірмаш), — шмат цікавых мерапрыемстваў. У прыватнасці, Міжнародны сімпозіум літаратараў «Пісьменнік і час» і ўзнагароджанне пераможцаў конкурсу «Мастацтва кнігі».

**Варвара МАРОЗАВА.**
**Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.**

Блізка да сэрца

# Кітай вельмі ўдзячны Беларусі за дапамогу ў барацьбе з каранавірусам

**Аб гэтым заявіў Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Кітая ў Беларусі Цуй Цымін.**


Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

У адпаведнасці з даручэннем кіраўніка дзяржавы Аляксандра Лукашэнкі ў тэрміновым парадку Паднябеснай прадстаўлена гуманітарная дапамога для прафілактыкі і кантролю эпідэміі, выкліканай новым тыпам каранавіруса. Яна была дастаўлена з Мінска ў Пекін. Як паведаміў Цуй Цымін, першая партыя дапамогі ад беларускага боку паступіла ва Ухань. Пасол КНР асабліва адзначыў, што беларускі самалёт з індывідуальнымі сродкамі абароны, медыкаментамі і сродкамі дэзінфекцыі стаў першым, які прыляцеў у Кітай з-за мяжы ў сувязі з сітуацыяй з каранавірусам. Дзеянні нашай краіны сталі прыкладам для ўсяго свету — цяпер гуманітарную дапамогу Пекіну накіравалі ўжо больш за 10 дзяржаў.

«У гэты цяжкі момант вельмі своечасовая і важная падтрымка Беларусі, ваш народ паказаў сваю дабрыню, — адзначыў Цуй Цымін. — Гэта сведчыць аб высокім узроўні стратэгічнага партнёрства паміж нашымі краінамі і моцнай дружбе паміж народамі». Па словах дыпламата, Кітай і Беларусь «падтрымліваюць цесную сувязь і каардынацыю ў супрацьстаянні каранавірусу».

«Старшыня КНР Сі Цзіньпін надае вялікае значэнне прафілактыцы і кантролю. Створана група па супрацьдзеянні эпідэміі, кіраўніком якой стаў прэм'ер-міністр Лі Кэцян. Ён адправіўся ва Ухань, каб на месцы кіраваць работай. Цяпер урад і народ Кітая прыкладаюць усе намаганні для барацьбы з эпідэміяй. Створана ўсебаковая і шматузроўневая сістэма прафілактыкі і кантролю, арыентаваная перш за ўсё на правінцыю Хубэй і горад Ухань. Уся работа, што праводзіцца, адкрытая, празрыстая», — адзначыў Цуй Цымін.

Урад Кітая накіраваў вялікую колькасць медперсаналу ў правінцыю Хубэй, у прыватнасці, 68 медыцынскіх брыгад, больш за 8 тысяч медыцынскіх работнікаў. Як падкрэсліў Цуй Цымін, Дзяржаўны савет КНР стварыў адзіную нацыянальную сістэму кантролю за сітуацыяй. Цяпер, паводле яго слоў, Кітай мабілізаваў унутраныя рэсурсы, адкрыў зялёны канал для транспарціроўкі неабходных матэрыялаў і засяродзіўся на забеспячэнні медыцынскім абсталяваннем правінцыі Хубэй.

Дарэчы, многія мерапрыемствы, якія праводзіць цяпер Кітай, куды больш жорсткія, чым рэкамендацыі Сусветнай арганізацыі аховы здароўя. «У нас ёсць упэўненасць і магчымасць перамагчы ў барацьбе з каранавірусам», — падкрэсліў Цуй Цымін. Як паведаміў дыпламат, у кітайскіх грамадзян, якія прыбылі ў Беларусь, выпадкаў захворвання не выяўлена.

Кітай спадзяецца, што неўзабаве настане пераломны момант у барацьбе з распаўсюджваннем новага тыпу каранавіруса, паколькі ўсё больш людзей вылечваюцца, а колькасць новых выпадкаў з падазрэннем на заражэнне зніжаецца. Аб гэтым заявіла падчас анлайн-брыфінгу афіцыйны прадстаўнік Міністэрства замежных спраў КНР Хуа Чунын.

**Мікалай ЛІТВІНАЎ.**

❍ ТЫМ ЧАСАМ

## ДРУГІ БОРТ З ГУМАНІТАРНАЙ ДАПАМОГАЙ НАКІРАВАЎСЯ Ў ПЕКІН



Па рашэнні кіраўніка дзяржавы Аляксандра Лукашэнкі ў Кітай адправіўся яшчэ адзін борт з гуманітарным грузам у сувязі з успышкай каранавіруса 2019-nCoV, паведаміла МНС.

Курсанты ўніверсітэта грамадзянскай абароны Міністэрства па надзвычайных сітуацыях і ратавальнікі правялі загрузку яшчэ аднаго самалёта з гуманітарнай дапамогай, які накіруецца ў Кітай. Гэта тавары медыцынскага прызначэння агульнай вагой каля 20 тон, якія сабраны згодна з запытам кітайскага боку.

Работы па фарміраванні і адпраўцы дапамогі вядуцца ў цесным супрацоўніцтве міністэрстваў абароны, аховы здароўя, замежных спраў і МНС. Першы борт прыбыў у Кітай ноччу 31 студзеня. Другі гуманітарны груз таксама суправаджаюць ратавальнікі на чале з намеснікам міністра па надзвычайных сітуацыях Ігарам Болатавым. Выпраўляць дапамогу ў Кітай прыехалі міністр аховы здароўя нашай краіны Уладзімір Каранік, а таксама Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Кітая ў Беларусі Цуй Цымін.

## Акуляры для аптыміста

*Едзем дадому з доўгай прагулкі па горадзе, малодшая пачынае капрызіць на роўным месцы — тое не так, гэта не гэтак, дайце мне ўвесь свет і пячэнькі. Пажылая жанчына побач уголас здзіўляецца: «А чаму ты плачаш?» Але, перш чым я паспяваю напружыцца ў чаканні маралі накшталт «добрыя дзяўчаткі не плачуць» ці «вось з сабою забяру», дадае: «У цябе ж такая прыгожая ўсмешка!». Малая разгублена ўсміхаецца, потым яшчэ і яшчэ — а каму не даспадобы кампліменты? А жанчына на маю ўдзячнасць тлумачыць: «Я сорак гадоў была настаўніцай малодшых класаў, падыходы ёсць. І ведаеце, што?.. Мы вельмі мала хвалім нашых дзяцей. Не забывайцеся іх хваліць, добра?». На развітанне малая доўга махала ёй рукой праз акно, не сціраючы ўсмешку з твару.*

*У штодзённай мітусні я, магчыма, забылася б на гэту сустрэчу. Але праз тыдзень давялося стаяць у чарзе ў дзіцячай паліклініцы. Чарга доўгая, сітуацыя напружаная, бо льготнікі розных катэгорый і «проста бацькі» высвятляюць адносіны паміж сабой, каб раней трапіць у кабінет і выбраць з мізэрнай колькасці дэфіцытных талончыкаў на масаж той, які мае самыя... зручныя час і дату. Талончыкаў мо з дзясятак, людзей у чарзе значна больш, многія спазняюцца на працу, а чаканне нясцерпна зацягваецца. Дзесяць хвілін, дваццаць; здаецца, зараз нехта выбухне скандалам, які ўжо адчувальна вісіць у паветры. І раптам... «Ой, якое немаўля прыгожанькае, якія ў яго ручкі маленькія і вочкі светлыя!» — звонка і радасна абвяшчае на ўвесь калідор дзяўчынка гадоў сямі-васьмі. Яна таксама ў гэтай чарзе разам з матуляй, і пакуль тая занятая чытаннем накірункаў, даведак і іншых медыцынскіх дакументаў, шпацыруе ўздоўж сцяны і гучна, а галоўнае, шчыра захапляецца наваколльнымі. — «Мамачка, глядзі, якая цёця прывабная — яна вышэй за ўсіх тут, і такія ямачкі ў яе на шчоках, калі ўсміхаецца. Ой, а куды маленькі падзеўся — сышоў? Ён жа да нас яшчэ вернецца? Спадзяюся, ён не хварэе, а толькі па талончык прыйшоў — ён такі сімпатычны!» І адбываецца цуд. Праз некалькі хвілін спакойна і прыязна ўсміхаюцца ўжо ўсе прысутныя, бо амаль кожны атрымаў сваю порцыю ласкі і ўхвалы. А скандал растварыўся, так і не пачаўшыся, хоць чарга рухаецца нікольні не хутчэй. І мне чамусьці здаецца, што ніхто з дарослых не «разруліў» бы гэту сітуацыю лепш — хіба толькі тая, выпадкова сустрэтая настаўніца, у якой «ёсць падыходы».*

*Вось праўда, калі вы апошні раз кагосьці хвалілі — блізкага, далёкага, сябра, калегу, малазнаёмага — не ліслiва, каб дамагчыся свайго ці атрымаць якія-небудзь бонусы, не дзяжурна, каб замяніць матэрыяльны стымул маральным, а шчыра, хоць бы пад уплывам моманту? (Як пытаўся капітан Джэк Верабей у паплечнікаў-піратаў: «Хоць хто-небудзь выратоўваў мяне проста таму, што засумаваў?») Я не маю на ўвазе штучныя памяншальныя суфіксы. Калі гаворка імі перасыпаная па справе і без, то звароты «чалавечак», «разумненькая ты мая» і да таго падобнае больш раздражняюць, чым падабаюцца. Рэч у тым, каб проста праявіць увагу — да калегі, якой вельмі пасуе новая прычоска, да вадзіцеля тралейбуса, які пачакаў хвілінку і прытрымаў табе адчыненымі дзверы, і, канешне, да ўласнага дзіцяці, якое калі і не прынесла са школы ўсе «дзясяткі», затое перамыла посуд без напаміну. Усё па класіцы — простыя словы, простыя рэчы, каштоўнасць якіх разумееш толькі праз час... Дрэнная, негатыўная часцей кідаецца ў вочы і даўжэй помніцца, але ці варта на ім засяроджвацца? Мо, адшукаем адзін у адным штосьці добрае і прыгожае? Нездарма кажуць, што прыгажосць — у вачах таго, хто глядзіць...*

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**


# Сямейная газета

**Выпуск № 3 (139)**


Азбука прафесій

# Людзі, якія гадуюць новых людзей, або Мая мама — выхавальніца!

**Пра завязванне шнуркоў, крызіс трох гадоў і любоў без умоў — у нашай традыцыйнай рубрыцы**



Фота Таццяны ТКАЧОВАЙ.

**Паводле звестак Міністэрства адукацыі, сёння ў 2940 установах дашкольнай адукацыі розных тыпаў і 858 вучэбна-педагагічных комплексах выхоўваюцца звыш 436 тысяч дзяцей дашкольнага ўзросту, з якімі займаюцца амаль 57 тысяч педагогаў. Узровень ахопу дзяцей дашкольнымі ўстановамі ў Беларусі, адзначаюць спецыялісты, адзін з самых высокіх сярод краін СНД.**

**Але па вялікім рахунку гэта ўсяго толькі сухія статыстычныя лічбы, за якімі хаваецца адна з самых патрэбных і важных, і прытым, даруйце за каламбур, адна з самых незаўважных у грамадстве прафесій — выхавацель дзіцячага садка.**

*(Заканчэнне на 5-й стар. «СГ».)*

Новы фармат

# РОДЫ ПА-СУЧАСНАМУ,

## Хто такая доўла?

**Калі пра партнёрскія роды з мужам многія не толькі чулі, але і прайшлі праз іх, то роды з доўлай, як і сама гэта прафесія, для большасці застаюцца таямніцай. Настасся Навіцкая, якая ўжо пяць гадоў дапамагае цяжарным жанчынам і суправаджае роды, расказала, што такое нараджаць з доўлай, колькі гэта каштуе і за што іх недалюблівае медперсанал.**



Фота Таццяны ТКАЧОВАЙ.

### Не масавая з'ява. Але...

— Многія думаюць, што гэты занятак звязаны з медыцынай і патрабуе медыцынскай адукацыі. На самай справе, не. Гэта прафесія афіцыйна прызнана ў многіх краінах, у тым ліку ЗША, Англіі, Ізраілі, Польшчы. І адпаведна, на яе ёсць навучанне і сертыфікацыя. Тут трэба разумець межы сваёй прафесіі і тлумачыць гэта кліентам. У Беларусі такой прафесіі афіцыйна няма. Але ўжо гадоў дзесяць, як доўлы ў нас існуюць. Праўда, назваць гэта масавай з'явай нельга. Цяпер у Мінску 4-5 доўл, якія суправаджаюць роды. Пры гэтым попыт на іх у жанчын цяпер прыкметна павышаецца.

Займацца ў нас на пастаяннай аснове гэтым немагчыма. Яшчэ некалькі гадоў таму было дастаткова складана трапіць у радзільню. Апошнім часам стала прасцей, нашы радзільныя дамы сёння больш адкрытыя. Нараджаць з доўлай можна ў межах партнёрскіх родаў — калі з нейкіх прычын муж не можа ці не хоча прысутнічаць, а жанчыне патрэбна падтрымка. Паўтаруся, яна не медыцынская. Я магу зрабіць абязбольваючы масаж пояснiцы, пакажу позы, у якіх, магчыма, стане лягчэй, падыхаем разам, дапамагу схадзіць у душ, падтрымаю жанчыну маральна, калі сілы будуць яе пакідаць, паклічу доктара. Пры гэтым, згодна з прынцыпамі этычных нормаў, доўла ніколі не прымае за жанчыну рашэнняў і нічога не навязвае. Яна проста знаходзіцца побач, і яе падтрымка часам больш прафесійная, чым у мужа, бо яна сама — жанчына і хутчэй за ўсё — маці, ведае, як працякаюць роды і мае спецыяльную падрыхтоўку.

*(Заканчэнне на 3-й стар. «СГ».)*

# Універсітэт для мам і тат

## Дзе навучыцца выхоўваць, разумець і любіць?

**Выбудоўваць бесканфліктныя стасункі з малымі, разумець матывы іх паводзін, ствараць умовы для змястоўнай сумеснай дзейнасці... Гэтымі і іншымі навыкамі шчаслівага сямейнага жыцця мамы і таты могуць авалодаць у бацькоўскіх універсітэтах, якія павінны з'явіцца ва ўсіх школах Беларусі. Магчыма, з часам можна будзе пазбавіцца ад самых галоўных, на думку бацькоў, «дзіцячых» праблем: ляноты, камп'ютарнай і інтэрнэт-залежнасці і непаразумення з бацькамі.**

### Вопыт і інтуіцыя — наша ўсё?

Праграма для навучання бацькоў была распрацавана ў Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэце (БДПУ). Стваралася яна не на пустым месцы, а абапіраючыся на вынікі даследавання, у якім удзельнічалі 680 бацькоў гарадскіх і сельскіх школьнікаў. 7 % апытаных мам і тат ва ўзросце да 29 гадоў, звыш за 55 % — да 40. Такім чынам спецыялісты атрымалі ўяўленне аб клопатах, надзеях і перажываннях у разнастайных сем'ях.

— Перш за ўсё трэба ўсведамляць, што нашы дзеці — новае пакаленне. І сённяшнія бацькі — таксама новае пакаленне, — кажа **Вера МАРТЫНАВА *(на фота)*, дэкан факультэта сацыяльна-педагагічных тэхналогій БДПУ.** — Яны выраслі і сфарміраваліся ў час інтэнсіўнага інфармацыйнага асяроддзя. Як кажуць некаторыя спецыялісты, інфармацыйны свет — вадкасны, незразумела, хто ў ім жывы, а хто не. Моладзь страчвае сувязь з рэальным светам і сыходзіць у віртуальны. Праз гэта губляюцца ўвага, любоў, разуменне ва ўзаемаадносінах паміж бацькамі і дзецьмі. Мяняецца светапогляд і каштоўнасці, з'яўляецца залежнасць.



Гэта запатрабавала ад педагогаў пошуку сучасных форм работы з бацькамі і дзецьмі. Ва ўмовах школы, на іх думку, сродкам для наладжвання стасункаў у сям'і павінен стаць бацькоўскі ўніверсітэт.

— Сёння многія бацькі разумеюць, што выхоўваць дзяцей — азначае выхоўвацца самім. Нездарма ж кажуць, што «мы пайшлі ў першы клас», «у нас пераходны ўзрост». У аснове працы з мамамі і татамі павінны ляжаць іх запыты, — упэўнена дэкан.

Вынікі вышэйназваных даследаванняў маюць як станоўчыя паказчыкі, так і адмоўныя. Радуе, што амаль 87 % бацькоў адказалі, што ў цэлым у іх існуе ўзаемаразуменне з дзецьмі. Разам з тым больш за трэціну бацькоў падчас выхавання маюць пэўныя праблемы — 21 % мам і тат не заўсёды здольныя паўплываць на сваё дзіця. У выніку расце адчужанасць, непаразуменне з малымі. 12 % бацькоў адзначылі, што вельмі рэдка гавораць з дзецьмі па душах.

Спецыялісты лічаць, што атрыманая інфармацыя сведчыць пра недастатковую кампетэнтнасць дарослых у выхаванні. Тое ж даследаванне паказала, што, выхоўваючы дзіця, большасць бацькоў бяруць «звесткі» аб выхаванні з уласнага жыццёвага вопыту і інтуіцыі, а таксама абапіраюцца на вопыт выхавання ў сем'ях сваіх бацькоў. Толькі 21 % карыстаюцца кансультацыямі педагогаў і псіхолагаў.

### Тры школьныя прыступкі

Менавіта бацькоўскі ўніверсітэт здольны дапамагчы дарослым сфарміраваць выхаваўчыя навыкі, лічыць Вера Мартынава. Яна расказала аб праграме для навучання бацькоў, распрацаванай па трох прыступках.

Першая прыступка — «Маё дзіця — малодшы школьнік». З першага па чацвёрты клас бацькоў хвалюе развіццё малога, яго адаптацыя да школы, медыябяспека, псіхалагічныя асаблівасці. Спецыялісты БДПУ распрацавалі спецыяльную тэматыку для такіх бацькоў. У праграме разглядаецца значэнне сямейных традыцый у выхаванні і развіцці малых, станоўчыя эмоцыі ў жыцці школьніка, дапамога ў вучобе.

На другой прыступцы бацькоўскага ўніверсітэта — «Маё дзіця— падлетак» — тат і мам вучаць арганізоўваць здаровы лад жыцця дзяцей, іх вольны час, гаварыць пра палавое выхаванне, заўважаць псіхалагічныя асаблівасці падлеткаў.

— Важнымі для абмеркавання пытаннямі павінны стаць такія: «ваша дзіця вырасла», «жыццёвыя мэты падлетка», «асцярожна, суіцыд», «прафілактыка залежнасці», «медыябяспека», — лічыць дэкан. — Бацькам падлетка неабходны кансультацыі, якія датычацца стасункаў дзіцяці з равеснікамі, адказнага бацькоўства як асновы шчаслівай сям'і, школьных канфліктаў.

Заняткі па праграме трэцяй прыступкі — «Маё дзіця — старшакласнік» — заклiканы дапамагчы бацькам разабрацца з пытаннямі першага кахання сваіх дзяцей. Навучыць іх, як знайсці ўпэўненасць у сабе, як абраць прафесію, давесці да іх асновы прававога выхавання.



Самі бацькі вылучаюць прыярытэтныя формы работы з імі. Яны, напрыклад, хочуць бачыць у школе сумесныя са сваімі дзецьмі мерапрыемствы, індывідуальныя гутаркі і кансультацыі, размяшчэнне інфармацыі на школьным сайце, практычныя заняткі.

У інфармацыйна насычаным свеце трэба актыўна выкарыстоўваць інфармацыйна-камунікацыйныя тэхналогіі, упэўнена Вера Мартынава.

— Ва ўсім свеце людзі ў сярэднім знаходзяцца ў рэжыме «анлайн» шэсць гадзін сорак дзве хвіліны ў суткі. Падлеткі штодня праводзяць у інтэрнэце каля 3,5 гадзіны. Нам неабходна граматна запоўніць хоць бы частку гэтага часу. Духоўнай культурай, прыгажосцю, стварэннем, і пры гэтым падаць інфармацыю цікава.

Прадстаўнікі сістэмы адукацыі лічаць неабходным стварыць на школьных сайтах спецыяльныя старонкі для бацькоў, дзе можна размяшчаць актуальную інфармацыю. Прынамсі, змясціць там «залатыя» лекцыі вядучых спецыялістаў навукі і практыкі. А яшчэ практыкаваць бацькоўскія сходы ў «анлайн-рэжыме». Рэсурсны цэнтр БДПУ сумесна з Мінскім гарадскім інстытутам развіцця адукацыі ўжо паспяхова апрабавалі такую форму сходаў. Бачыцца карысным, каб у шосты школьны дзень у пэўны час сацыяльны педагог і педагог-псіхолаг праводзілі тэматычныя і індывідуальныя анлайн-кансультацыі. Такія формы работы дапамогуць вырашыць праблемы няпоўных і замяшчальных сем'яў, а таксама сем'яў, дзе выхоўваюцца дзеці з асаблівасцямі развіцця.

Бацькоўскі ўніверсітэт павінен быць створаны ў кожнай школе і будзе працаваць у адпаведнасці з распрацаванай для яго ў БДПУ праграмай, аднак з улікам асаблівасцяў школы, кантынгенту школьнікаў і іх бацькоў.

**Ірына СІДАРОК.**

---

Бяспека ў інтэрнэце

# «СЛАБАЕ ЗВЯНО» — МЫ САМІ

**Нікога ўжо даўно не здзіўляе, што трохгадовыя дзеці самастойна глядзяць мульцікі на YouTube, а людзі ва ўзросце ўпэўнена перапісваюцца ў сацсетках. Пры гэтым многія карыстальнікі не маюць дастатковай інфармацыі аб небяспецы ў інтэрнэце, у іх не сфарміраваны навыкі анлайн-культуры. Вынікі даследаванняў за мінулы год, праведзеных спецыялістамі «Лабараторыі Касперскага», сведчаць аб тым, што палова беларускіх дзяцей, якія карыстаюцца інтэрнэтам, атрымлівалі запрашэнне сябраваць ад незнаёмых людзей у сацыяльных сетках.**

### НАШЫ ТЫПОВЫЯ ПАМЫЛКІ

Спецыялісты прааналізавалі асноўныя праблемы, з якімі нашы карыстальнікі сутыкнуліся за апошні год. Лакальнымі пагрозамі (тымі, што распаўсюджваюцца праз флэшкі, здымныя цвёрдыя дыскі і г. д.) былі атакаваны 51 % беларускіх карыстальнікаў. Колькасць людзей, якія сутыкнуліся з нападамі ў інтэрнэце, склала 42 %.

Аказваецца, беларусы і самі не вельмі асцярожныя ў пытаннях бяспекі. 11 % апытаных прызналіся, што перадавалі логін і пароль для ўваходу ў працоўны акаўнт калегам, якія не з'яўляюцца прадстаўнікамі службы тэхнічнай падтрымкі, 25 % спампоўвалі за апошні год патрэбныя для працы праграмы з неафіцыйных рэсурсаў, а 6 % выкарыстоўвалі карпаратыўны паштовы адрас, каб зарэгістравацца на сайтах для вырашэння пытанняў, не звязаных з працай.

— З пункту гледжання інфармацыйнай бяспекі сёння найбольш «слабым звяном» застаецца сам чалавек, — адзначае **прадстаўнік «Лабараторыі Касперскага» ў Беларусі Дзмітрый КУДРЭВІЧ.** — Часта зламыснікам нават нічога не трэба ўзламваць, яны звяртаюцца да старой, як свет, сацыяльнай інжынерыі — у выніку людзі самі выдаюць ім усе патрэбныя даныя.

Спецыяліст упэўнены, што ў бліжэйшыя гады ландшафт пагроз будзе мяняцца, і рызыкі для карыстальнікаў будуць яшчэ большымі. Кібермахляры пастаянна асвойваюць новыя платформы і вынаходзяць новыя тактыкі.

### МОЙ ЛЮБІМЫ ГАДЖЭТ...

Дзеці і падлеткі — вельмі актыўныя карыстальнікі сеткі. Так, паводле даных апытання, у 57 % беларускіх дзяцей ва ўзросце 7—9 гадоў ужо ёсць уласны смартфон або планшэт. У 15—18-гадовых лічба дасягае 97 %. 23 % дзяцей ва ўзросце 7—18 гадоў праводзяць з гаджэтам амаль увесь вольны час, пры гэтым 30 % бацькоў прызналіся, што ніяк не кантралююць і не абмяжоўваюць працягласць выкарыстання дзіцем розных прылад.

> 43 % дзяцей ва ўзросце 7—18 гадоў атрымлівалі запрашэнні сябраваць ад незнаёмых людзей. У 12 % выпадкаў ім прыходзілі прапановы сябраваць ад незнаёмых дарослых.

— Па даных ананімнага апытання, сярод 170 тысяч падлеткаў з дзесяткаў краін свету больш за трэць расказалі, што падвяргаліся цкаванню ў інтэрнэце, — адзначае **старшы каардынатар па абароне дзяцінства прадстаўніцтва ЮНІСЕФ у Рэспубліцы Беларусь Дзмітрый ШЫЛІН.** — Без належнага кантролю інтэрнэт можа стаць крыніцай розных пагроз. **Важна інфармаваць дзяцей і іх бацькоў аб небяспецы ў лічбавай прасторы і прывіваць ім навыкі правільнага карыстання інтэрнэт-інструментамі.** Пры разумным падыходзе інтэрнэт спрыяе развіццю дзіцяці, дапамагае яму вучыцца і мець нармальныя адносіны з аднагодкамі.

### ПАРАДЫ АД ЭКСПЕРТАЎ

Не пераходзьце па сумнеўных спасылках з лістоў, паведамленняў у месенджары або SMS.

Рэгулярна ўстанаўлівайце абнаўленні для аперацыйнай сістэмы і дадаткаў.

Выкарыстоўвайце складаныя і розныя паролі для ўсіх акаўнтаў.

Спампоўвайце дадаткі толькі з афіцыйных крам.

Дапамажыце дзіцяці асвоіцца ў інтэрнэце.

Завядзіце разам з ім акаўнт у сацыяльнай сетцы, пошце, гульнявым сэрвісе. Пакажыце, што ён можа атрымаць, праводзячы час у анлайне.

Раскажыце аб анлайн-пагрозах, растлумачце элементарныя правілы анлайн-бяспекі.

Дзіця павінна ведаць пра такія непрыемныя рэчы, як, напрыклад, кібербулінг. Важна данесці да дзіцяці, што яно не вінаватае, калі яго сталі цкаваць у інтэрнэце. Растлумачце, як дзейнічаць у такой сітуацыі: не адказваць на цкаванне. Ігнараванне — самы верны спосаб звесці з'яву на нішто.

Дамоўцеся аб асноўных правілах паводзінаў. Напрыклад, не карыстацца гаджэтам падчас абеду, гуляць у анлайн-гульні толькі 1-2 гадзіны ў дзень, не сядзець у тэлефоне пасля 22.00. Лепш, калі гэтыя правілы будуць выконваць усе члены сям'і, бо дзеці шмат у чым арыентуюцца на дарослых.

**Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.**

# РОДЫ ПА-СУЧАСНАМУ...

## Не пакрыўдзіць жанчыну

— Мой бацька прымаў роды — ён акушэр. У свой час захапляўся натуральнымі родамі, шмат расказваў пра гэта. Я з юнацтва была ў тэме. Але атрымала юрыдычную адукацыю і працавала ў офісе спецыялістам па кадрах. Дарэчы, сваю старэйшую дачку я нараджала са сваім татам (цяпер у Настассі ўжо чацвёра дзяцей: 16-ці, 13-ці, 3-х і 1,5 гадоў, — **«Зв».**) І толькі калі зацяжарыла трэцім, актыўна пачала займацца гэтай тэмай. Рэч у тым, што мае другія роды былі не зусім удалыя: яны пачаліся заўчасна, давялося тэрмінова ехаць у радзільны дом, існавала рызыка, што дзіця не выжыве. У гэтым вінавацілі мяне — я адчула шмат акушэрскай агрэсіі. Таму пасля мне хацелася дапамагаць усім жанчынам, каб з імі не здарылася таго, што адбылося са мной. Затое свае трэція роды я пражыла так, як і планавала. А апошнія былі ўвогуле выдатныя.

**«Гэта незямное пачуццё! Кожны раз я пражываю роды з жанчынай, быццам бы свае. Кожная з іх потым становіцца быццам бы маёй сваячкай».**



Фота Таццяны ТКАЧОВАЙ.

Раней як доўла я магла схадзіць на роды адзін-два разы на год, як і астатнія калегі-дзяўчаты. Цяпер часцей: адны-двое родаў на месяц. Але менавіта сертыфікат на родавую доўлу не атрымлівала. Я скончыла курсы масажу ў Акадэміі фізвыхавання, вучылася розным відам масажу ў Мінску і Маскве, у Санкт-Пецярбургу атрымала сертыфікат выкладчыка перынатальнай ёгі (я цяпер праводжу ёгу для цяжарных і жанчын пасля родаў). Акрамя таго, наведваю тэматычныя семінары, канферэнцыі — займаюся гэтай тэмай шчыльна апошнія некалькі гадоў. Праўда, не ўпэўнена, ці хацела б у будучым працягваць гэта, бо работа вельмі цяжкая. Сёння мая дзейнасць звязаная ў асноўным з ёгай для цяжарных, курсамі дародавай падрыхтоўкі, аднаўленнем пасля родаў, масажамі.

Я зарэгістравала грамадскае аб'яднанне «Нараджэнне». У нас больш за 50 удзельнікаў па ўсёй Беларусі. Гэта кансультанты па грудным кармленні, доўлы, акушэркі, медыкі, псіхолагі. Мы праводзім семінары і канферэнцыі, даводзім да жанчын новую інфармацыю, запрашаем удзельнікаў з іншых краін падзяліцца вопытам. Займаемся праектам па перынальных стратах — чытаем лекцыі ў радзільнях па тэму, як правільна размаўляць з жанчынай, як не параніць яе, не пакрыўдзіць.

## Асаблівасці работы

— Звычайна жанчыны самі пра мяне даведваюцца, знаходзяць у сацсетках, выходзяць на сувязь. Мы сустракаемся, знаёмімся. Жанчына глядзіць, ці падыходжу я ёй, а я магу прапанаваць кагосьці іншага з калег. Я заўсёды даю кантакты іншых доўл, каб быў выбар. Часам адмаўляюся ад суправаджэння родаў, бо браць больш за двое на месяц — гэта цяжка.

Пасля знаёмства ў нас пачынаецца кантактаванне. Я заўсёды за тое, каб жанчына як мага больш са мной камунікавала: прыйшла на індывідуальную кансультацыю, ёгу ці заняткі па падрыхтоўцы да родаў (у камандзе з акушэркай і псіхолагам мы вядзём курсы для цяжарных). Трэба, каб мы з жанчынай адчувалі адна адну. Гэта дзве-тры сустрэчы да родаў.

Потым пачынаецца пастаяннае кантактаванне: у жанчыны мільён пытанняў, і ў маёй асобе яна знаходзіць чалавека, якому ўсё гэта адрасуецца. Гэта могуць быць і медыцынскія, і псіхалагічныя аспекты. Урачэбныя пытанні я перанакіроўваю знаёмым акушэрам-гінеколагам ці рэкамендую жанчыне звярнуцца да ўрача.

Калі пачынаюцца роды, мы разам едзем у радзільню. З жанчынай я знаходжуся побач, нікуды не адыходзячы. У гэтай рабоце ў мяне няма перапынкаў, колькі б яна не доўжылася. Перадапошнія роды, напрыклад, працягваліся 19 гадзін, апошнія — 16. Гэта вельмі стамляе.

Калі жанчына нарадзіць, я яшчэ дзве-тры гадзіны знаходжуся з ёй. Магу схадзіць і паглядзець, як там немаўля, ці сяджу і трымаю дзіця, каб яго не забіралі. Потым праводжу яшчэ адну сустрэчу пасля родаў. Прыязджаю да жанчыны дадому праз тыдзень-два пасля выпіскі, раблю пасляродавы масаж, адказваю на пытанні — у мяне ёсць адукацыя кансультанта па грудным кармленні. Увесь гэты пакет паслуг (дародавыя і пасляродавыя сустрэчы і самі роды) і называецца суправаджэннем родаў. Яно можа быць, дарэчы, і частковым — па тэлефоне, калі жанчына са мной на сувязі ўсю цяжарнасць і падчас родаў. Таксама магчымы варыянт, калі я магу даехаць да радзільні, а далей жанчына ідзе з мужам.

### Аб коштах за паслугі

— Чамусьці існуе меркаванне, што гэта вельмі дорага. Поўны пакет паслуг каштуе 500 рублёў. Калі палічыць па колькасці адпрацаваных гадзін — сустрэчы, анлайн-кансультацыі, самі роды 15-19 гадзін, — то гэта невялікія грошы. А работа вымотваючая.

Складана, калі жанчына сама баіцца родаў, непрыемных адчуванняў і закрываецца, заціскаецца. Часам амаль суткі на кожную схватку робіш масаж паясніцы і рук не адчуваеш...

Трэба разумець, што наяўнасць доўлы не гарантуе станоўчага зыходу родаў, і як усё пойдзе, немагчыма прадказаць. Аднойчы дзіця прыйшлося рэанімаваць, бо яно не дыхала. Гэта той выпадак, калі мама баялася болю, патугі доўжыліся 3,5 гадзіны. Было сапраўды страшна.

## Чаго не хапае нашым радзільням

— Цяпер вельмі шмат станоўчых змен адбылося ў нашых радзільных дамах, многае ў апошнія пяць гадоў памянялася. Але самае важнае, на што я зрабіла б упор, гэта этыка і дэанталогія, кантактаванне медыцынскага персаналу з пацыентамі. Хочацца, каб гэта былі адносіны як да кліента, а не як да пацыента. Бо тыя ж партнёрскія роды — гэта платная паслуга. Што я бачу, калі прыходжу ў радзільню? Перагружаныя ўрачы, якія ў шчырай размове прызнаюцца, што змена ў іх доўжыцца другія суткі. Як аднаўляцца ў такой сітуацыі? Трэба нейкімі мерамі заахвочваць іх да адпачынку. Усе яны вельмі адукаваныя і высокакваліфікаваныя спецыялісты. Але перагрузка і эмацыянальнае выгаранне не лепшым чынам адбіваюцца на прафесійным іміджы.

Калі роды ідуць добра, адчуваецца, што я нікому не перашкаджаю. Наадварот, мне рады: медперсаналу можна крыху расслабіцца, бо ёсць я. Але ж калі штосьці ідзе не так, то вінаватая таксама я. Мяне адразу пачынаюць заўважаць, я адчуваю ў свой бок раздражненне. Звычайна жанчыне кажуць: «Паставім вітамінку». Я ж ведаю, што гэта аксітацын, гармон, які стымулюе родавую дзейнасць. І не маўчу, бо жанчыне павінны растлумачыць, што гэта за прэпарат і для чаго ён. І медыкаў гэта, вядома, раздражняе.

### Чаму выбіраюць доўлу

**— Паводле рэкамендацый Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, жанчына можа пайсці на роды з тым партнёрам, з якім яна жадае. Гэта можа быць і мама, але яна эмацыянальна ўключаецца, перажывае за дачку і можа сваё перажыванне перадаць ёй. Тое самае і муж, яны часам перажываюць да такой ступені, што іх саміх даводзіцца супакойваць. Доўла так эмацыянальна не ўключаецца. Гэта той чалавек, які знаходзіцца ў цвярозым розуме заўсёды.**

## І аб самым прыемным

— Канешне, кожны раз, калі нараджаецца малое і яго кладуць маме на жывот, слёзы коцяцца самі сабой. Гэта незямное пачуццё! Кожны раз я пражываю роды з жанчынай, быццам бы свае. Кожная з іх потым становіцца быццам бы маёй сваячкай — дасылае мне фотаздымкі дзіцяці, расказвае, як ідуць справы. У нас застаецца моцная сувязь.

Мне падабаецца і пасляродавае аднаўленне, калі я прыходжу да мамы. Звычайна пасля родаў усе забываюцца пра жанчыну, на першым месяцы ў сям'і дзіця. Я цэлы дзень прысвячаю жанчыне: раблю пяць-шэсць відаў масажу, купаю яе ў ванне, гатую спецыяльны напой, мы размаўляем. Для жанчыны гэта сапраўдны цуд!

Пасляродавае спавіванне — гэта мексіканская цырымонія, я вучылася ёй у мексіканскай акушэркі. Там гэта вельмі распаўсюджана. Жанчыне робяць масаж, прамасліваюць і прагрываюць цела, а потым абгортваюць жанчыну ў прасціны, перацягваюць кожную частку цела спецыяльнымі паланцінамі. У гэтым ёсць свой сэнс. Гармон рэлаксін, які дапамагаў расцягвацца звязкам і суставам падчас родаў, яшчэ нейкі час працягвае выпрацоўвацца. З-за гэтага ўсе тканкі і мышцы мяккія. І калі пачынаць актыўную дзейнасць пасля родаў, гэта негатыўна адаб'ецца на арганізме. Фізічныя практыкаванні лепш аднаўляць праз два месяцы. Мы спачатку разаграваем цела, для гэтага жанчына п'е спецыяльны напой накшталт морсу, прымае ванну з травамі, потым загортваецца ў сем слаёў прасцін — і такім чынам рэлаксін разам з потам выходзіць з арганізма. Калі цела перацягваеш паланцінам, усе костачкі становяцца на месца, знікаюць выступаючы жывот і ацёкі, з'яўляецца больш энергіі. Гэта мая любімая частка працы.

**Алена КРАВЕЦ.**

### Ці абавязкова жанчыне рыхтавацца да родаў

**— Маё асабістае меркаванне — рыхтавацца трэба. Як мінімум, абавязкова даведацца аб фізіялогіі працэсу, як ён праходзіць, якія могуць быць ускладненні, умяшальніцтвы, і скласці ў галаве прыкладны план. Задача акушэраў — каб усе засталіся ў жывых, але ніхто не расказвае жанчыне, як сябе адчуваць пасля родаў. Напрыклад, што практыкаванні на прэс у першыя два месяцы рабіць не рэкамендуецца. Гэтыя мышцы вельмі моцна расцягнутыя, аслабленыя, і іх лепш не напружваць.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

## Караць нельга дапамагчы

На мяжы паміж свавольствам і злачынствам

**Праект канцэпцыі ўдасканалення юстыцыі для непаўналетніх, распрацаваны ў Беларусі, дае магчымасць падлеткам выправіць свае памылкі. Аднаўленчыя працэдуры ў дачыненні да дзяцей, якія пераступілі закон, дапамогуць ім хутчэй сацыялізавацца і ўпісацца ў законапаслухмяны асяродак. Для гэтага трэба пашыраць такія метады работы, як медыяцыя і дасудовая прабацыя, лічаць эксперты.**

Такі падыход, аднак, не азначае адсутнасці пакарання і не супярэчыць прынцыпу яго няўхільнасці. Падлетак мусіць звесці да мінімуму наступствы свайго ўчынку: пакрыць урон або памірыцца з пацярпелым. Правесці работу над сабой і памылкамі малому дапамогуць спецыялісты. Калі на працягу года вінаваты дакажа, што перагледзеў жыццёвыя прыярытэты, да крымінальнай адказнасці яго не прыцягнуць.

— Канцэпцыя мае эканамічны, сацыяльны і дэмаграфічны патэнцыял. Яе прынядце дазволіць уцягнуць падлетка ў эканамічнае жыццё краіны і прынесці карысць грамадству, — упэўнены **прадстаўнік Дзіцячага фонду ААН (Юнісэф) Рашэд Мустафа САРВАР.** — Ва ўмовах неспрыяльных дэмаграфічных прагнозаў прымяненне аднаўленчых падыходаў дазволіць захаваць дзіця ў грамадстве, развіць чалавечы капітал, а гэта ўжо пытанне нацыянальнай бяспекі.

Статыстыка сведчыць, што 90 % злачынстваў падлеткаў не прадстаўляюць грамадскай небяспекі. Часцей за ўсё моладзь вырашаецца на крадзеж, другое па папулярнасці злачынства — хуліганства. Іншым разам хапае прафілактычнай бяседы, каб парушальнік зразумеў, што нарабіў.

Сярод новых падыходаў да ўдасканалення юстыцыі для непаўналетніх — абмежаванне публічнага распаўсюджвання інфармацыі аб удзеле падлетка ў крымінальным судаводстве ці адміністратыўным працэсе, каб не дапусціць яго стыгматызацыі.

У выпадках цяжкіх і асабліва цяжкіх злачынстваў: забойстваў, разбояў, наркотыкаў — аднаўленчыя працэдуры прымяняцца не будуць. Праўда, магчыма ўвядзенне новай формы ўстановы для выканання пакарання ў выглядзе пазбаўлення волі, якое прызначана непаўналетнім, — выхаваўчага цэнтра, які ствараецца шляхам пераўтварэння выхаваўчай калоніі для асуджаных непаўналетніх.

**Ірына СІДАРОК.**

# ПАРАНЕНЫЯ СЭРЦЫ



## Што чакае малых, ад якіх адмовіліся ў радзільні

*Любили тебя без особых причин*
*За то, что ты дочь,*
*За то, что ты сын,*
*За то, что малыш,*
*За то, что растешь,*
*За то, что на папу и маму похож.*
*И эта любовь до конца твоих дней*
*Останется тайной опорой твоей.*
*В. Берастаў.*

...Палата на хвіліну падаецца пустой. Тры маленькія дзяўчынкі, якім няма і месяца, ляжаць ціха. Заўважаю, што адна з іх сканцэнтравана некуды ўглядаецца. Яна чуе голас дарослых, але адчувае, што звяртаюцца не да яе, таму маўчыць. Разглядаю вясёлую рознакаляровую бялізну, на якой ляжаць малыя, але ад гэтага яшчэ больш не па сабе. Адзін ложачак пусты, ён якраз выклікае ў мяне самыя прыемныя пачуцці. Няхай так і будзе, няхай у бальнічных палатах не ляжаць дзеці, ад якіх адмовіліся іх самыя родныя і блізкія людзі — матулі.



Педыятр-неанатолаг Вікторыя ХАЦЬКО і медсястра Галіна АСТРЭЙКА.

### ПЕРШЫЯ ДНІ

— Да нас вязуць немаўлят з усіх радзільных дамоў Мінска, — гаворыць галоўны ўрач 3-й гарадской дзіцячай клінічнай бальніцы Максім Ачэрэтні. — Жанчыны, якія адмаўляюцца ад сваіх дзяцей у радзільні, прадстаўляюць усім розныя слаі насельніцтва: студэнткі і навучэнкі, жанчыны з вышэйшай адукацыяй і тыя, што вядуць маргінальны лад жыцця... Нядаўна ў нас было дзіця зусім маладзенькай студэнткі, жыла яна ў іншым горадзе, а ў Мінску нарадзіла. Яе бацькі не ведалі пра тое, што яна цяжарная, і, адпаведна, нават не здагадваліся, што ў іх нарадзіўся прыгожы і здаровы ўнук. Але гэта гісторыя з добрым канцом. Маладая маці праз дваццаць дзён прыехала да нас і напісала адкліканне адмовы ад хлопчыка.

Дарэчы, любая жанчына, якая вырашыла адмовіцца ад свайго дзіцяці, можа забраць сваю заяву назад, але часу на гэта няшмат — толькі да суда, на якім яе пазбавяць бацькоўскіх правоў. Такія гісторыі бываюць, і, як прызналіся супрацоўнікі бальніцы, яны вельмі ўмацоўваюць веру ў людзей.

### САМОТНАЕ ЖЫЦЦЁ

Жанчыны пасля родаў адмаўляюцца браць іх на рукі, папярэджваюць акушэраў, каб ім не прыносілі на кармленне малога. Чаму? Калі няма пачуццяў да дзіцяці, не хвалюе лёс народжанага, чаго баяцца? Але мне самой было страшна. Страшна ўбачыць вочы кінутых дзяцей, іх адзіноту. Жанчыны звычайна пішуць адмову адразу ў радзільні. Прычынай указваюць «цяжкае матэрыяльнае становішча» ці «стан здароўя немаўляці». У бальніцу прывозілі дзетак не толькі здаровых, але з сіндромам Даўна, і паліятыўных малых.

— Паліятыўнымі лічацца дзеці з невылечнымі захворваннямі, якія прывядуць да смерці ці пажыццёвай інваліднасці, — тлумачыць галоўны ўрач бальніцы. — Але хацеў бы падкрэсліць, што ад хворых дзяцей адмаўляюцца не часцей, чым ад здаровых.



Калі жанчына піша адмову, яна павінна пазначыць, ад каго адмаўляецца. У сэнсе, напісаць прозвішча малога, даць імя... Супрацоўнікі радзільных дамоў ужо самі рэгіструюць пакінутых малых. І толькі потым вязуць у 3-ю дзіцячую бальніцу. Юрысты ўстановы звязваюцца з органамі апекі і паведамляюць аб паступленні такога малога ў клініку.

У сярэднім дзеці-«адмоўнікі» знаходзяцца ў бальніцы прыкладна месяц. За гэты час вырашаецца іх лёс. У малых тры варыянты развіцця падзей: дзіцячы дом, усынаўленне ці апека.

— За мінулы 2019 год непасрэдна з бальніцы былі ўсыноўлены чацвёра «адмоўнікаў», — расказвае юрысконсульт бальніцы Ірына Герасімава. — Дваіх дзетак узялі пад апеку, а васьмярых накіравалі на дзяржаўнае забеспячэнне ў дзіцячы дом. Пасля таго як жанчына напісала адмову ад свайго дзіця, яна піша заяву, дзе пагаджаецца на яго ўсынаўленне іншымі людзьмі. Органы апекі маюць інфармацыю аб усынавіцелях, у якіх падрыхтаваны ўсе дакументы. Яны накіроўваюць гэтых людзей да нас. Будучыя бацькі прыязджаюць, знаёмяцца з дзіцем, могуць пакарміць яго, пераапрануць, памяняць памперс, пакачаць на руках. Звычайна гэта падрыхтаваныя і вельмі чулівыя людзі. Яны да малых адносяцца як да вялікай каштоўнасці. У самым лепшым выпадку дзеці, якіх выбіраюць усынавіцелі, праз 20-22 дні ўжо едуць дамоў.

Вось і цяпер адну з дзяўчынак у палаце для адмоўнікаў «знайшлі» бацькі. Я паглядзела на малую. Яна ўжо прачнулася і пачала крахтаць. Педыятр адразу дастала яе з ложка і пачала гушкаць на руках.

— А адзенне для малых адкуль? — спытала я, здзівіўшыся, што ўсе дзеткі добра і чыста апрануты.

Калі праходзіла міма іншых палат, дзе ляжаць на лячэнні малыя з матулямі, праз шкло бачыла, з якой любоўю пераапранаюць тыя сваіх немаўлят, як нешта ім гавораць і смяюцца. Іншыя кармілі ці проста гушкалі малых на руках.

— Прывозяць дзяцей з радзільні ў адзенні, — тлумачыць педыятр-неанатолаг Вікторыя Хацько. — Тут на месцы мы іх пераадзяваем у адзенне наша. Нам шмат ахвяруюць валанцёры. Пераапранаем малых штодня абавязкова або па меры забруджвання адзення. Кормяць іх кожныя тры гадзіны медсёстры, якія замацаваныя амаль за кожным дзіцем.

У палату заходзіць зусім маладзенькая медсястра. Яна працуе ўсяго два з палавай гады. Адразу бярэ дзяўчынку, якой толькі два тыдні ад роду, на рукі. Малая не плача — трывожна прыслухоўваецца да размовы.

— Я заўсёды хацела працаваць з дзецьмі, — расказвае медсястра Галіна Астрэйка. — Але ўсвядоміць, што ёсць кінутыя дзеці, цяжка. Памятаю, у першыя дні сваёй працы я даглядала хлопчыка. Ён такі ладненькі быў, здаровы, але... Яго ніхто не забраў. Мне асабіста прыйшлося везці яго ў дзіцячы дом. Гэта цяжка.

Дзяўчына падчас аповеду інстынктыўна прыціскае да сябе дзяўчынку, якую трымае на руках. Я пачынаю глядзець у акно. Там голыя дрэвы паднялі свае галіны да неба, нібыта застылі ў нямым пытанні.

— Ці даводзілася вам даваць імёны гэтым дзецям?

— Так, бывае і такое. Але не часта, — прызнаецца юрысконсульт Ірына Герасімава. — Звычайна гэта здараецца, калі нам прывозяць малога, ад якога маці афіцыйна не адмовілася ў радзільні, але падчас выпіскі проста знікла. Нам прыходзіцца рэгістраваць такіх дзетак самім і прыдумваць ім імёны. Такіх маці не проста знайсці, калі яны ў «бягах»... Зацягваецца афармленне дзетак ад іншаземных грамадзянак, якія адмовіліся ад малых — тут падрыхтоўка дакументаў займае больш часу. Але сёлета было ажно два выпадкі, калі жанчыны да суда аб пазбаўленні бацькоўскіх правоў паспявалі перадумаць, пісалі заяву аб скасаванні адмовы і забіралі сваіх дзетак дамоў. Гэта з'ява рэдкая, але яна прыносіць шмат радасці, бо пазбаўляе нас ад ненатуральнага абавязку — везці малых у дзіцячы дом.

...Выйшаўшы з бальніцы, я агледзелася. Вакол шмат дзяцей: кагосьці выпісалі, нехта прыехаў лячыцца.... Але ўсе з матулямі, бацькамі, бабулямі... Ідуць, моцна трымаюць родных за руку, самыя маленькія едуць у прыгожых калясках. Яны ўсе пад аховай, з моцнай апорай у жыцці. Але ёсць у гэтым вялікім будынку палата, дзе ляжаць тры здаровыя дзяўчынкі, пакінутыя ў трывожным маўчанні і чаканні. Няўжо іх лёс — дзіцячы дом?

**Наталля ТАЛІВІНСКАЯ, фота аўтара.**

# Людзі, якія гадуюць новых людзей...

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

Пра тое, ці дастаткова проста любіць дзяцей, каб працаваць з імі, і чаму з дарослымі знайсці агульную мову бывае цяжэй, чым з малымі, мы распыталі **Наталлю СІНІЧЭНКУ, якая працуе выхавальніцай у дзіцячым садку № 1 горада Сянно,** і яе сына-дзесяцікласніка Глеба. Месца і героі, між іншым, абраны невыпадкова: яслі-садок стаў лепшым у раёне па выніках мінулага года, а сама Наталля Мікалаеўна нядаўна выйграла раённы этап конкурсу прафесійнага майстэрства педагагічных работнікаў у намінацыі «Выхавальнік дашкольнай адукацыі»..

***— Існуе распаўсюджаны і davoli крыўдны стэрэатып, маўляў, у выхавацелі сёння бяруць усіх, незалежна ад адукацыі. Глеб, ці ведаеш ты, чаму мама выбрала гэтую прафесію?***

**Глеб:** Як расказвала бабуля, маме з дзяцінства падабалася дапамагаць даглядаць меншых дзяцей, займацца з імі. Гісторыю станаўлення мамы як выхавальніцы я дакладна не ведаю, але ведаю, што гэта быў свядомы выбар — больш за тое, мама пайшла вучыцца ў педагагічны інстытут нават насуперак жаданню бацькоў...

> **«Навучыць дзяцей самастойнасці ў нашых умовах, калі многія дарослыя схільныя да гіперапекі, вельмі няпроста».**

**Наталля:** Так, бацькі хацелі, каб я ішла ў медыцынскі. А я паступала туды, дзе не трэба здаваць матэматыку *(смяецца)*. Насамрэч, я заўсёды любіла дзяцей, але, шчыра прызнаюся, не ўяўляла цалкам сутнасць працы выхавацеля — мне здавалася, трэба толькі даглядаць малых, а практыка паказала, што неабходна навучыць іх не толькі навыкам самаабслугоўвання і завязвання шнуркоў, але і, напрыклад, навучыць гукавому аналізу слова ці ўменню адрозніваць творы выяўленчага мастацтва па жанры.

***— Як правіла, бацькі-выхавацелі стараюцца не браць у групу сваіх дзяцей. У вас як было?***

**Глеб:** Мама працавала ў маім садку, але ў іншай групе, да нас прыходзіла хіба што на замену. Затое бабуля была маім настаўнікам у пачатковай школе, і я на сабе адчуў долю «настаўніцкіх дзяцей», бо ў пятым класе некаторыя настаўнікі спачатку казалі, што бабуля «нацягвала» мне адзнакі. Давялося даказваць, што гэта не так.

**Наталля:** Так, гэта прынцыповы момант: на працы я павінна быць выхавальніцай, а не мамай, якая глядзіць за сваім дзіцем. Нават калі ў Глеба ішоў адаптацыйны перыяд да садка, я не заходзіла да яго ў групу, каб не перашкаджаць



калегам, — і трэба сказаць, адаптацыя прайшла лёгка, ён, можа, дні тры капрызнічаў, а потым асвоіўся.

***— Выхавацелю цяжэй кантактаваць з дзецьмі ці з дарослымі?***

**Глеб:** Калі гаварыць канкрэтна пра маю маму, мне здаецца, ёй з дзецьмі больш камфортна — гэта не толькі яе праца, але і яе жыццё. Калі я праводжу больш часу ў школе, то мама большую частку дня — на працы, і нават дома яна, бывае, да ночы рыхтуецца да заняткаў, распрацоўвае прэзентацыі, друкуе справаздачы, прыдумвае штосьці цікавае, стараецца ўкласці ўсю душу ў прафесію. Толькі калі вельмі стамляецца, можа папрасіць мяне аб дапамозе.

**Наталля:** На сёння магу сказаць, што ўстанавіць кантакт з бацькамі і зрабіць так, каб яны насамрэч табе даверaлі, нашмат складаней, чым з дзецьмі. Бо для таго, каб дзеці пачалі табе давяраць і не плакалі, трэба толькі быць з імі шчырай, адкрытай. Дарослыя настолькі адвыклі давяраць каму б там ні было, што для іх «адаптацыі да садка» патрэбны прыкладна год, і для гэтага неабходна, каб яны бачылі цябе не толькі ў раздзявальні ці на фармальных бацькоўскіх сходах. Некаторыя распытваюць, колькі дзіця з'ела лыжак кашы, колькі супу... А гэта далёка не галоўная, а другасная рэч. Таму я стараюся часцей размаўляць з бацькамі, расказваць ім, што такое крызіс трох гадоў, які ў большасці дзяцей супадае з першым паходам у садок і адаптацыяй. Бацькі часам думаюць, што дзіця плача, бо не хоча ў садок, — а гэта ў асноўным якраз з-за бацькоўска-дзіцячых стасункаў, калі малое хоча рабіць усё само, а яго распранаюць і кормяць, як маленькае... Але з «маімі» бацькамі — а цяпер у групе па спісе 18 дзяцей, але пастаянна ходзіць менш — мне пашанцавала, мы адно аднаго слухаем, чуем і падтрымліваем. Хоць, па шчырасці, загружанасць часта перашкаджае нават прачытаць дадатковую навукова-метадычную літаратуру па сваёй спецыяльнасці, не тое што прыдумаць нешта цікавае і

крэатыўнае... Мне здаецца, калі б зменшыўся аб'ём папяровай працы, сіл хапіла б горы звярнуць.

***— Што, на ваш погляд, самае складанае ў рабоце выхавацеля?***

**Глеб:** Я лічу, што якраз знайсці падыход да бацькоў, усталяваць даверлівыя і ўзаемапаважлівыя адносіны, каб не ўзнікалі на роўным месцы канфлікты з-за дробязяў, калі бацькі, не разбіраючыся, абвінавачваюць выхавацеля ў некампетэнтнасці. Увогуле, мне здаецца, каб выслухоўваць усе бакі і прыходзіць да кампрамісу, выхавацелю патрэбная вельмі моцная, устойлівая псіхіка.



**Наталля:** Дзякуй, сыночак *(смяецца)*! Для мяне самае складанае — навучыць дзяцей быць самастойнымі. Я разумею, што педагог, выхаванец і бацькі ў ідэале мусяць шчыльна ўзаемадзейнічаць, але навучыць дзяцей самастойнасці ў нашых умовах, калі многія дарослыя схільныя да гіперапекі, вельмі няпроста. Таму Глеб мае рацыю: я спачатку тлумачу гэта бацькам, паказваю каштоўнасць «я магу», да якога імкнецца кожнае дзіця, а потым мы дзейнічаем разам.

***— А што самае прыемнае ў прафесіі выхавацеля — зачыніць дзверы за апошнім выхаванцам і выдыхнуць?***

**Глеб:** На мой погляд, маме падабаецца кантактаваць з дзецьмі, адкрываць у іх пэўныя таленты і здольнасці, аналізаваць праведзеную працу і ўсведамляць, што многім рэчам навучыла гадаванцаў менавіта яна.

**Наталля:** Найвялікшае задавальненне адчуваю, калі іду па вуліцы, і мае былыя выхаванцы, якім ужо 16, а каму і 20 гадоў, усміхаюцца і вітаюцца. Альбо, напрыклад, якраз пад намі жыве мая колішняя выхаванка — і яна пры сустрэчы можа сказаць: «Наталля Мікалаеўна, якая ў вас класная сукенка — можна я пазычу яе ў

вас на вечарынку?» Гэта праўда вельмі важна і прыемна.

***— Нават самы вялікі аптыміст, мяркую, пагодзіцца, што выхавацель — гэта не пра грошы. Дзеля чаго і каму варта ісці ў прафесію, як вы мяркуеце?***

**Глеб:** Варта ісці толькі ў тым выпадку, калі ты адчуваеш, што гэта дакладна твой шлях, табе падабаецца сама атмасфера, ты гатовы не толькі займацца з дзецьмі, але і запаўняць мноства дакументаў, і выслухоўваць прэтэнзіі бацькоў... Дарэчы, я крыху не згодны з тым, што калі ты працуеш выхавацелем, то залатых гор ніколі не будзе. Можна развіць свае кампетэнцыі і, напрыклад, працаваць у недзяржаўным, прыватным садку, альбо самому адкрыць падрыхтоўчыя групы для садка ці разгледзець іншыя варыянты.

> **«Дарослыя настолькі адвыклі давяраць каму б там ні было, што для іх «адаптацыі да садка» патрэбны прыкладна год».**

**Наталля:** На мой погляд, ісці вучыцца і працаваць у дашкольную адукацыю можна таму, што ты будзеш упэўнены — цябе будуць шчыра любіць. Маленькія дзеці любяць без умоў, без усялякіх «але», адкрыта і аддана.

***— Калі Глеб вырашыць ісці працаваць у дзіцячы садок...***

**Глеб:** Сумняваюся. Я не супраць пабыць з адным-двума малымі, але ж не з 22 дзецьмі ў групе! Разы, можа, два я дапамагаў маме ў арганізацыі ранішнікаў ці нейкіх паходаў, і пераканаўся, што гэта вельмі няпростая, карпатлівая праца. З дзецьмі ўсё ж вельмі складана, іх трэба любіць і адчуваць. А мяне больш вабіць юрыдычны кірунак, ужо займаюся з рэпетытарам па грамадазнаўстве і англійскай мове, пакуль не выбраў дакладна, у якую навучальную ўстанову паступаць, але ж час вызначыцца яшчэ ёсць.

***— Калі сказаць у некалькіх словах, то выхавальнік — гэта...?***

**Глеб:** Гэта чалавек з вялікай літары. Чалавек, які сапраўды гадуе новых людзей, мае найвышэйшы ўзровень адказнасці і ўмее знаходзіць падыход да кожнага дзіцяці, якое ўжо — індывідуальнасць са сваім характарам, з тымі ці іншымі станоўчымі і адмоўнымі рысамі.

**Наталля:** У трох словах? Тады так: гуманны, прафесійны і неардынарны чалавек.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**
**Фота Тацяны ТКАЧОВАЙ.**

### «Сонны» лайфхак

Адна з праблем, якую вайной і мірам спрабуюць вырашыць бацькі дашкольнікаў — пакласці малое спаць днём. Наталля Сінічэнка гаворыць, што ўсё ў руках саміх бацькоў: «Я абсалютна згодна з навукоўцамі, якія распрацавалі прыкладны распарадак дня дашкольніка. І калі вашае дзіця ўстане а сёмай раніцы, а пасля ўсіх заняткаў у яго будзе фізкультхвілінка, калі прагулка будзе дастаткова актыўнай, з уключэннем усіх неабходных кампанентаў, — то, паверце, у гадзіну дня пасля добрага абеда малое будзе моцна спаць. Наогул, калі дома прытрымлівацца такога ж рэжыму, як у дзіцячым садку, то і вам будзе нашмат прасцей, і менш будзе капрызаў «не хачу ў садок».

## Мамін дзённік

# «ГРЫНПІС» ДБАЕ

**Што такое «ба», у нашай сям'і ведае кожны. І гэта не скарочаны варыянт ад «бабулі», як вы, хутчэй за ўсё, падумалі. І нават не азначае, што нехта ўпаў ці штосьці звалілася. Гук «ба» наш Цёмік гаворыць часцей, чым мама і тата: малы шалёна захоплены смеццявозамі і ўсім, што з імі звязана. Паперку ў сметніцу выкінуў — «ба» зрабіў, смеццявоз спустошае кантэйнеры з адходамі — «ба» працуе, мульцік ці відэа пра гэтую машыну хоча паглядзець — нясе мой тэлефон, амаль істэрычна «бакаючы»...**

Не абыходзіцца без «ба» і падчас шпацыру. Пакуль знаходзімся на вуліцы, Арцёмка не абміне ніводнай сметніцы: гойдае іх туды-сюды, барабаніць колькі ёсць сілы па жалезных кантэйнерах. Здаецца, усе навакольныя бамжы ды алкаголікі ведаюць нашага Цёміка, які не дае ім спакойна рабіць сваю работу.

І ўсё было б нармальна, каб аднойчы не захацелася мне, такой «разумніцы», паказаць Арцёмку, як смеццявоз ачышчае кантэйнеры, што, як на ліха, даўно прапісаліся пад нашымі вокнамі. З таго часу малога не адцягнеш ні ад акна (будзе енчыць, пакуль не возьмеш на рукі і не адсунеш фіранку), ні ад бакаў. Толькі выходзім з пад'езда — прамой наводкай да іх, стаўшых мне такімі ўжо агіднымі за гэты час.

«Пэўна, у сферы жыллёва-камунальных паслуг будзе працаваць», — ці то жартам, ці то ўсур'ёз кажуць суседзі. А мне ўжо не да смеху: мала што кожны дзень мыю рукавічкі (зімовую куртку часта не памыеш, хоць яна часам выглядае не лепш, чым у таго насельніка бакаў), даводзіцца яшчэ ледзь не дэзінфікаваць Арцёмкаў твар пасля такіх «пацалункаў» з бруднымі скрынямі.

І ніякія просьбы, альтэрнатывы ў выглядзе мульцікаў ці чупа-чупсаў і нават палоханне Бабай Ягой, з якой ён звычайна баіцца сустрэцца, не дапамагаюць. Учапіўся нядаўна за сметніцу і не адарваць. Акурат падышла жанчына — ну, вельмі, прабачце, на тую самую гераіню з казак падобная, — ды давай гаварыць, што забярэ з сабой, калі не будзе слухаць маму. А Цёмік плакаць пачаў ды... яшчэ мацней прыціснуўся да сметніцы.

І есці не сядзе, пакуль «ба» яму не ўключу. Відаць, не адзін ён такі аматар — ніколі не падумала б, што пра смеццявозы нават мульцікі прыдумалі, міні-кіно пра цацачныя машыны наздымалі. Ужо не кажу пра відэаролікі, у якіх сапраўдныя смеццявозы ездзяць па дарогах і вось так, як у нас, гудуць пад вокнамі.

Але, як кажуць, няма ліха без дабра. У нас у хаце ніводнай паперкі ці цукеркі не заўважыш. Пёрка ад падушкі, амаль нябачны валасок, крупінку, якую выпадкова выпусцілі з рук, калі варылі кашу, — усё занясе ў вядро. І на вуліцы Цёмік не прапусціць ніводнага фанціка, ні адной бутэлькі — адразу нясе ў сметніцу. Адным словам, Грынпіс адпачывае.

**Вераніка КАНЮТА.**

Центр Промышленной Оценки

- Организация аукционов
- Оценка всех видов имущества

## Извещение о проведении аукциона

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | ОАО «Паритетбанк», г. Минск, ул. Киселева, 61а |

**Предмет аукциона**

**Гараж на 8 м/мест** (здание специализированное автомобильного транспорта), общей площадью 183 кв. м, инвентарный номер 500/С-32469, по адресу: г. Минск, ул. Калиновского, 113Б. **В состав лота входит иное имущество,** перечень которого размещен на сайте организатора аукциона www.cpo.by.

**Сведения о земельном участке**: предоставлен на праве аренды по 30.04.2020 г. для эксплуатации и обслуживания здания специализированного транспорта общей площадью 0,0858 га. Ограничения (обременения) прав: обеспечить доступ эксплуатационным организациям – владельцам инженерных коммуникаций для производства ремонтно-восстановительных работ, площадь 0,0885 га

| | |
|---|---|
| **Начальная цена с НДС 20 %** | 164 921,67 бел. руб. |

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на счет **BY60BLBB30120191021390001001** в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки», УНП 191021390

| | |
|---|---|
| **Срок заключения договора купли-продажи** | **10** рабочих дней после проведения аукциона |

**Условия оплаты предмета аукциона:** в течение **30 (тридцати) календарных дней** со дня заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by**

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения аукциона** | **31.03.2020** в 13.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Дата и время окончания приема документов** | **27.03.2020** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Контактные телефоны** | **+375 17-280-36-37; +375 29 317-95-42. E-mail: auction@cpo.by** |

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ НЕДВИЖИМОГО ИМУЩЕСТВА, ПРИНАДЛЕЖАЩЕГО РУП «БЕЛПОЧТА»

| Наименование и местоположение объекта | Начальная цена продажи, BYN | Сумма задатка, BYN | Общая площадь, кв. м | Коэф. от 0,5 до 3,0 |
|---|---|---|---|---|
| ЛОТ – помещение площадью 22,0 кв. м, расположенное в изолированном помещении с инвентарным номером 100/D-93423 (наименование: изолированное помещение; назначение: помещение связи), расположенное по адресу: Брестская обл., г. Брест, ул. Богданчука, 124–66 | 92,95 | 9,30 | 22,0 | 3,0 |

**Продавец:** Брестский филиал РУП «Белпочта», 224010 г. Брест, пр-т Машерова, 32, УНП 20100378

**Организатор аукциона:** Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

Реквизиты для перечисления задатка: р/с BY76BPSB30121789380179330000 в ОАО «БПС-Сбербанк» Региональная дирекция № 100 по Брестской области, г. Брест, ул. Мицкевича,10, BIC Банка BPSBBY2X, УНП 201028245

**Условия:**

1. Срок аренды: не менее 3 лет.
2. С победителем аукциона в течение 10 рабочих дней будет заключен договор аренды помещения.
3. Стоимость права заключения договора аренды должна быть выплачена продавцу в течение 3 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона за вычетом задатка.
4. Возместить Организатору аукциона расходы по их проведению в течение 3 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.
5. Для размещения офиса, складского помещения, оказания услуг, организации производства (кроме вредных производств)

**Аукцион состоится 11 марта 2020 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325**

Сведения о документах, которые необходимо представить для участия в аукционе, и иную информацию можно узнать у организатора аукциона по телефонам: 8 (0162) 20-92-13, 21-88-81

Размер штрафных санкций, предусмотренных Указом Президента Республики Беларусь от 05.05.2009 (в ред. указов Президента Республики Беларусь от 11.12.2009 г. № 624, от 23.09.2011 г. № 431, от 10.01.2013 г. № 14), составляет 10 базовых величин

**Последний день приема заявлений – 10 марта 2020 г. до 17.00**

## Извещение о проведении повторных электронных торгов

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона / оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка». Юридический адрес: г. Минск, ул. Мележа, 5, корп. 2, пом. 1703. Адрес ЭТП: **www.ipmtorgi.by** |
| **Продавец** | Индивидуальный предприниматель: Леванович Дмитрий Александрович. Юридический адрес: г. Минск, пр-т Рокоссовского, 18, корп. 1, кв. 417 |

**Предмет электронных торгов: капитальное строение, расположенное по адресу: г. Минск, пер. Стахановский, 2/7**

| Наименование (назначение) | Общ. пл. | Инв. номер |
|---|---|---|
| **Здание художественной мастерской** (здание неустановленного назначения). Составные части и принадлежности (согласно техническому паспорту): навес (пл. 43 кв. м) | 32,6 кв. м | 500/С-63479 |

**Сведения о земельном участке:** доля в праве аренды на земельный участок (1/3) общ. пл. 0,0392 га, предоставленный для эксплуатации и обслуживания зданий неустановленного назначения по пер. Стахановскому, 2, 2/7

В состав лота входит иное имущество. С перечнем данном имущества можно ознакомиться на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: **www.ipmtorgi.by**

**Начальная цена (без НДС): 82 500,00 бел. руб.**

**Доп. информация:** предмет аукциона находится в ипотеке (залогодержатель – ЗАО «Идея Банк»)

| | |
|---|---|
| **Порядок ознакомления** | Осуществляется в рабочие дни с 9.00 до 21.00, ответственное лицо: Леванович Дмитрий Александрович, контактные телефоны: +375 (44) 773-35-38, + 375 (29) 773-31-88 |

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/с BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; УНП 191224638; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка»

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **10 (десять) рабочих дней** после электронных торгов |

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

**Электронные торги проводятся в порядке, установленном регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить затраты на организацию и проведение аукциона, а также оплатить Организатору торгов вознаграждение в размере 3 (трех) процентов он цены продажи предметов аукциона в течение **3 (трех) рабочих дней** после проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов, без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении электронных торгов опубликовано в газете «Звязда» 16.01.2020

| | |
|---|---|
| **Дата и время начала и окончания электронных торгов** | Начало торгов: **21.02.2020 в 10.00.** Окончание торгов: **21.02.2020 в 12.00.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов |
| **Дата и время окончания приема заявок** | Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 20.02.2020. до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: **www.ipmtorgi.by** |
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 17-280-36-37; +375 (29) 317-95-42; +375 (44) 704-92-06. E-mail: auction@cpo.by; info@ipmtorgi.by** |

## ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению Республиканского дочернего унитарного предприятия по обеспечению нефтепродуктами «Белоруснефть-Гомельоблнефтепродукт» (продавец имущества) извещает о проведении 21 февраля 2020 года открытого повторного аукциона со снижением начальной цены на 80 % по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20

**Местонахождение:** Гомельская область, Гомельский р-н, г. Речица, на АЗС 1. **Примечание:** имущество реализуется в соответствии с п.п. 2.3 ст. 93 НК РБ, при условии выполнения п. 4.1 Указа Президента Республики Беларусь № 169 от 10.05.2019 «О порядке распоряжения государственным имуществом»

| № лота | Наименование предмета торгов | Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС (20 %), бел. руб. | Сумма задатка, с учетом НДС (20 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | **Компрессор К-20 (инв. № 4485_r).** Техническое состояние составных частей компрессора: двигатель, магнитные пускатели, головки компрессорные, трубопроводы с обратными клапанами находятся технически в исправном состоянии. В районе одной из 4 опор ресивера, объемом 500,0 л имеется трещина длиной около 2,5 см. Компрессорная установка К-20 (инв. № 4485_r) пригодна к эксплуатации при условии ремонта | **274,61** | 27,46 |

**Продавец**: РУП «Белоруснефть-Гомельоблнефтепродукт», 247012, пос. Янтарный,12, Поколюбичский с/с. **Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел.** 8 (0232) 99-33-87 – Лариса Ивановна. **Шаг аукциона – 5 %. Для участия в аукционе необходимо: 1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Продавца (РУП «Белоруснефть-Гомельоблнефтепродукт»):** р/с: BY82 BLBB 3012 0490 3217 3000 1001 в ОАО «Белинвестбанк», БИК BLBBBY2X, УНП 490321730, назначение платежа – задаток за участие в аукционе за лот № 1 (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления). **2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 6 февраля 2020 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00. Прием заявлений для участия в аукционе **заканчивается 19 февраля 2020 г. в 16.00 включительно (предварительно по контактным телефонам Организатора торгов).** Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. **В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником**, объект аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Продавцом** в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; произвести оплату услуг (вознаграждение) за организацию и проведение торгов, затраты за публикацию в газете «Звязда» в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола; заключить договор купли-продажи в течение **20 (двадцати) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество в срок согласно договору купли-продажи с момента подписания договора купли-продажи. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» «О порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части)». **Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 23.10.2019 г. № 202 (29069). Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы». Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора торгов: 8 (0232) 23-23-54, 23-23-56, 8 (029) 126-66-62**

## РУЭСП «Днепробугводпуть»

### ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ КАПИТАЛЬНОГО СТРОЕНИЯ, ПРИНАДЛЕЖАЩЕГО РУЭСП «ДНЕПРОБУГВОДПУТЬ» НА ПРАВЕ ХОЗЯЙСТВЕННОГО ВЕДЕНИЯ

| Наименование | Характеристика |
|---|---|
| **Лот № 1: право заключения договора аренды капитального строения с инв. № 130/С-30429 сроком на три года** | Здание магазина № 5 с инв. № 130/С-30429. Назначение – здание специализированное розничной торговли. Количество этажей – 1. Общая площадь – 85 м$^2$. Материал стен – кирпичные. Техническое состояние – удовлетворительное. Местонахождение: Брестская область, г. Пинск, ул. Ленинградская, 15 |
| **Начальная цена продажи права заключения договора аренды** | 359,13 руб. |
| **Сумма задатка** | 10 процентов от начальной цены продажи права заключения договора аренды (35,91 руб.) |
| **Сумма арендной платы в месяц** | 10,625 базовой арендной величины (179,56 руб. на 04.02.2020) |

Все призы до 25 июня 2020 г. (включительно) будут перечислены каждому Победителю на его текущий (расчетный) счет в ОАО «Белгазпромбанк», доступ к которому обеспечивается банковской платежной карточкой платежной системы Mastercard, эмитированных ОАО «Белгазпромбанк» в рамках банковского продукта «Карта покупок», участвующей в Рекламной игре. В случае отсутствия у Победителя текущего (расчетного) счета в ОАО «Белгазпромбанк», доступ к которому обеспечивается карточкой «Карта покупок», сумма приза будет перечислена на любой активный текущий (расчетный) счет Победителя, открытый в ОАО «Белгазпромбанк» в белорусских рублях, доступ к которому обеспечивается банковской платежной карточкой, эмитированной ОАО «Белгазпромбанк». Победитель должен проинформировать Организатора об отсутствии расчетного счета, в рамках банковского продукта «Карта покупок» до 19 июня 2020 г., отправив сообщение на электронный адрес: trivisionon@gmail.com или на телефон/факс Организатора (017) 290-90-01.

11.5. Призы не подлежат замене.

11.6. При получении призов Победители несут все права и обязанности по уплате подоходного налога в бюджет Республики Беларусь. Начисление, удержание и перечисление подоходного налога проводится в порядке, установленном Особенной частью Налогового кодекса Республики Беларусь.

11.7. Ответственность Организатора по выдаче призов ограничена исключительно вышеуказанным количеством и видами этих призов.

**12. Наименование печатного издания средства массовой информации для публикации Правил и результатов розыгрыша, сроки публикации.**

12.1. Правила Рекламной игры подлежат публикации в газете «Звязда» до начала Рекламной игры.

12.2. Результаты розыгрышей Рекламной игры подлежат публикации в газете «Звязда» не позднее 24 июня 2020 г.

**13. Права и обязанности участников Рекламной игры.**

13.1. Принимая участие в Рекламной игре, участники Рекламной игры подтверждают свое ознакомление и согласие со всеми условиями настоящих Правил, а также принимают на себя обязательство выполнять все требования настоящих Правил и законодательства Республики Беларусь, вытекающие из участия в Рекламной игре и/или связанные с получением призов.

13.2. Факт участия в Рекламной игре подразумевает, что ее участники соглашаются с тем, что в рамках данной Рекламной игры их имена, фамилии, отчества, фотографии, аудио- и видеоинтервью и иные материалы о них могут быть использованы Организатором в рекламных целях связанных с проведением и результатами данной Рекламной игры, в том числе по радио, телевидению, в глобальной компьютерной сети Интернет и в иных средствах массовой информации, а также сниматься для изготовления графических рекламных материалов без уплаты им какого-либо вознаграждения в рамках данной Рекламной игры. Все права, в том числе исключительные имущественные права, на такие интервью и результаты съемки будут принадлежать Организатору.

13.3. Участники Рекламной игры при заполнении регистрационной формы на сайте обязаны вводить достоверную информацию. Организатор не несет ответственность за достоверность данных, внесенных участниками Рекламной игры в регистрационную форму, а также за последствия внесения участником Рекламной игры недостоверной информации в регистрационную форму.

**14. Порядок предоставления информации по вопросам проведения Рекламной игры.**

14.1. Все возможные вопросы и претензии участников Рекламной игры в отношении организации и условий передачи Призов должны быть адресованы Организатору Рекламной игры по адресу: 220030, г. Минск, пр-т Независимости, 11/2, офис 328.

14.2. Информацию об условиях участия и проведения Рекламной игры можно получить по телефону 120, а также на сайте kartapokupok.by.

14.3. Организатор не вступает в споры между участниками Рекламной игры относительно определения собственника выигранного приза и/или претендентов на получение приза.

**15. Иные условия.**

15.1. Споры между Организатором и участниками Рекламной игры рассматриваются согласно законодательству Республики Беларусь.

*Свидетельство о государственной регистрации Рекламной игры № 3738 от 31.01.2020 г. выдано Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь*


## РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества ОАО «ПРОМСВЯЗЬ»

**Лот № 1, состав: 1.** Здание производственного корпуса, инв. № 600/С-73691, 471,5 кв. м. **2.** Склад горючего, инв. № 600/С-117572, 13,1 кв. м. **3.** Здание гаража, инв. № 600/С-73698, 58,5 кв. м. **4.** Здание дизельной, инв. № 600/С-73686, 55,0 кв. м. **5.** Многолетние насаждения (полный перечень приведен на сайте Организатора аукциона ino.by). Адрес: Минская обл., Минский р-н, Щомыслицкий с/с, район аг. Щомыслица. Земельный участок: кадастровый номер 623688000001000033, площадь – 0,7828 га. Право постоянного пользования. Переход права осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь. Обременение: покупатель обязан обеспечить свободный проезд и (или) проход к земельным участкам 623688000001001098 и 623688009101000905. **Начальная цена с НДС** – 158 190,00 бел. руб. **Задаток** – 8000,00 бел. руб. **Шаг аукциона** – 5 %. Размер штрафа в соответствии с соглашением о правах и обязанностях сторон в процессе организации и проведения аукциона составляет – 20 000,00 бел. руб.

**Аукцион состоится 03.03.2020 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4**

Порядок оформления участия в аукционе, условия участия в аукционе, срок подписания договора купли-продажи, условия оплаты, а также полный текст извещения содержатся на сайте Организатора аукциона ino.by. **Продавец:** ОАО «ПРОМСВЯЗЬ», г. Минск, ул. П. Бровки, 18. **Организатор аукциона:** РУП «Институт недвижимости и оценки», 220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9. Задаток перечисляется на р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, BIC BPSBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе 03.03.2020. Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.00 и с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 7. Окончание приема заявлений – 28.02.2020 в 11.00. Первое полное извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 27.12.2019 г.

**☎ Организатор аукциона: 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**


## Предоставление информации о деятельности Местного Фонда «Управление бизнесом» (далее – Фонд)

В соответствии с п. 46.2 «Положения о создании, деятельности и ликвидации Фондов в Республике Беларусь», утвержденного Указом Президента Республики Беларусь от 01.07.2005 № 302, сообщаем следующее:

1. Местный Фонд «Управление бизнесом» продолжает свою деятельность.

1.1. Директор и Совет Фонда располагаются по адресу: 223025, Республика Беларусь, Минская область, Минский район, д. Новое Поле, пер-к 2-й Лесной, д. 1, ком. 85.

2. Информация о количестве учредителей Фонда: 1 (один) учредитель – общество с ограниченной ответственностью «С нами будущее».

3. Информация о стоимости имущества Фонда:

3.1. Стоимость имущества, переданного учредителем Фонда – 3050,00 бел. руб.;

3.2. Поступления от проводимых в 2019 году мероприятий – 625,62;

3.3. Расходы понесенные Фондом – 145,76;

4. Информация об унитарных предприятиях, хозяйственных обществах, созданных Фондом, а также представительствах и филиалах – в 2019 перечисленные предприятия общества представительства и филиалы Фондом не создавались.

5. В 2019 году Фонд победил в конкурсе инициатив в рамках Проекта «Содействие развитию на местном уровне в Республике Беларусь». Инициатива направлена на поддержку предпринимателей и IT-стартапов в Борисовском районе.

УНП 692010044

# Летапісцы найноўшай гісторыі

## Дакументальнае кнігавыданне: сучасныя тэндэнцыі і праблемы

**...Спачатку было слова. Менавіта з яго пачынаюцца ўсе летапісы, рукапісы і друкаваныя дакументы, якія, у сваю чаргу, становяцца падмуркам для вывучэння гісторыі ад старажытнасці да нашых дзён. Па першых згадках у пісьмовых крыніцах мы вызначаем узрост гарадоў і мястэчак, па кнігах спасцігаем родную і замежную мовы, дакладныя навукі і прыгожае пісьменства. Але ў цяперашні, лічбавы час усё больш складана данесці слова да адрасата, зрабіць гісторыю захапляльнай — асабліва калі гаворка ідзе не пра мастацкую, а пра дакументальную літаратуру. Пра гэта разважалі нядаўна ўдзельнікі круглага стала «Кнігі — галоўныя летапісцы і сёння? Дакументальнае кнігавыданне: сучасныя тэндэнцыі і праблемы».**

**Павел СУХАРУКАЎ, дырэктар — галоўны рэдактар РВУ «Выдавецкі дом «Звязда»:**

— Вельмі прыемна, што адзін з удзельнікаў — наш добры сябар, вядомы гісторык, філакартыст, калекцыянер, пісьменнік Уладзімір Ліхадзедаў, аўтар шматлікіх унікальных кніг, якія выйшлі менавіта ў Выдавецкім доме «Звязда». Ягоны аўтарскі праект «У пошуках страчанага» пра гісторыка-культурную спадчыну нашай краіны, што не раз быў адзначаны высокімі ўзнагародамі, вылучаны на суіскание Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь 2020 года. Я ведаю, што Уладзімір Аляксеевіч укладвае душу ў гэту працу, што гэта справа ўсяго яго жыцця, безумоўна, вартая не толькі нашага прафесійнага, але і самага шырокага грамадскага прызнання. Але сёння хацелася б гаварыць не толькі пра гэты праект, а паразважаць наогул пра дакументальнае кнігавыданне: як яно развіваецца ў сучасных умовах, з якімі праблемамі сутыкаецца і якую будучыню наогул мае.

**Уладзімір ЛІХАДЗЕДАЎ, гісторык, філакартыст, публіцыст:**

*— Я лічу, што якраз той фармат, у якім я працую, — самы што ні ёсць сучасны. Не сакрэт, што сёння людзі не надта любяць чытаць, асабліва моладзь, збольшага разглядаюць карцінку. Старыя фотаздымкі — якраз самы бесстаронні сведка гісторыі. Бо нават калі ты чытаеш гістарычную кнігу, мемуары, дакументалістыку, то чытаеш аўтарскую падачу, меркаванне. А фотаздымак — рэч аб'ектыўная, паказвае, як было на самай справе: вось так выглядаў шмат гадоў таму той ці іншы будынак, такія шыльды былі на крамах, такое адзенне насілі. У той час не было фоташопу, былі, праўда, калажы, але гэта іншая рэч. Таму, паўтаруся, стары фотаздымак — бесстаронні сведка таго часу. А другі важны момант — што нават тыя, хто не любіць чытаць, карцінкі ўсё ж глядзяць. І, зладзіўшы не адзін дзясятак выставак, я бачу, што людзі, якіх «зачапіла» карцінка, ужо бяруць у рукі і кнігу, і ў многіх прачынаецца цікавасць да гісторыі. Таму, я лічу, з дапамогай фотаздымкаў кнігі дакументальнага фармату, якія мы абмяркоўваем, таксама выіграюць — больш актыўна ідзе прыцягненне, захапленне людзей гісторыяй. Я часта згадваю фразу: «Народы, якія не помняць сваёй гісторыі, знікаюць» — і лічу, што трэба прыкласці ўсе намаганні, каб нашы людзі, асабліва моладзь, памяталі, у якой краіне мы жывём, ганарыліся сваёй гісторыяй і дакладна ведалі, хто з гістарычных дзеячаў што гаварыў, абапіраючыся не на інтэрнэт, у якім можна напісаць што заўгодна, а на факты і доказы.*



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

**Віктар ЛІСКОВІЧ, старшыня Пастаяннай камісіі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу:**

— Працуючы ў свой час у медыцыне, я таксама займаўся навукай, у прыватнасці напісаў восем манаграфій, падручнік па арганізацыі ахову здароўя, а потым прыйшоў у палітыку, больш пераключыўся на сацыяльную тэматыку, і першыя два гады проста не было часу на навуковую дзейнасць. Але потым зразумеў, што калі не «стаўбіць» тое, што мы робім, то час будзе ўпушчаны — і ў 2017 годзе з'явіўся праект «Гродзеншчына ўчора і сёння», дзе мы паказалі адны і тыя ж сюжэты ў мінулым, да станаўлення беларускай дзяржавы, і параўналі з сёлетнімі дасягненнямі. Была вялікая цікавасць да гэтай тэмы, і за тры гады з нашай ініцыятывы ўбачылі свет 17 выданняў, якія адлюстроўваюць пэўныя этапы жыцця і развіцця Гродзенскага рэгіёна. Я перакананы, што зрабіў правільна. Гэта значны вынік, кнігі — тое, з дапамогай чаго можна выхоўваць наша маладое пакаленне, тое, што адлюстроўвае развіццё нашай краіны... Год таму мы пазнаёміліся з Уладзімірам Ліхадзедавым у Іванаве, на Дні беларускага пісьменства, і, можна сказаць, знайшлі адзін аднаго — я адчуў, што Гродзеншчына не павінна ўпусціць такі момант, і з дапамогай Уладзіміра Аляксеевіча мы рознымі шляхамі падрыхтавалі чатыры кнігі, прысвечаныя Гродна, Слоніму, дзе ў верасні быў Дзень пісьменства, Смаргоні, дзе летась прайшлі «Дажынкі», і Навагрудку, які адзначыў 975-годдзе. У мяне ў галаве ўжо склаўся вялікі бізнес-праект, які падтрымлівае і аўтар, Уладзімір Аляксеевіч, — працягваць расказ пра Гродзеншчыну. На бягучы год у планах не менш за чатыры кнігі, ужо магу анансаваць, што адна будзе прысвечана Фестывалю нацыянальных культур, які пройдзе ў першыя выхадныя чэрвеня ў Гродне, таксама плануем зрабіць выданні пра Ліду, Шчучын і Ваўкавыск. На мой погляд, праект Уладзіміра Ліхадзедава вельмі ўдалы ў тым сэнсе, што падобныя кнігі не толькі маюць цікавы навукова-публіцыстычны характар, але таксама з'яўляюцца выдатнай прэзентацыяй горада і будуць добрым падарункам для любога замежнага госця, дыпламатычнага прадстаўніцтва і г. д.

Таксама летась мы рэалізавалі сумесна з БелТА цікавы праект — выпусцілі да юбілею Гродзенскай вобласці кнігу «Гродзеншчына», вельмі добра аформленую і змястоўную. Пабачыла свет выданне «Мастацкі вобраз Гродзеншчыны». Разам з «Гродзенскай праўдай» зрабілі выданне «Гродзеншчына гасцінная» пра турыстычны патэнцыял вобласці: так, адна з кніг прысвечаная водным рэсурсам Гродзенскай вобласці і расказвае пра асноўныя водныя артэрыі рэгіёна і цікавінкі вакол іх; зусім нядаўна выйшла кніга «Аўгустоўскі канал: незвычайная гісторыя і новае жыццё», а на бягучы год у гэтай серыі запланаваная кніга «Гродзеншчына: запаведны свет» пра заказнікі і запаведнікі вобласці, іх турыстычныя магчымасці. У сакавіку выйдзе кніга «Гродзеншчына спартыўная», таксама рыхтуем альбомнае выданне, прысвечанае 100-годдзю нашага краязнаўчага музея; упершыню мы выдалі кнігу з работамі гродзенскіх мастакоў — паказалі развіццё рэгіёна праз іх творы... І яшчэ цэлы шэраг кніг, якія асвятляюць розныя бакі жыццядзейнасці рэгіёна. Інтэрнэт — сіла, магутная рака, але ўсё гэта хуткаплынна, а кнігі, я перакананы, не толькі раскажуць нам пра гісторыю, але і ўзбагацяць нашу будучыню. Таму ў тэзісе «Кнігі — галоўныя летапісцы і сёння?» можна смела замяняць пытальнік на клічнік.

**Алесь СУША, намеснік дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі па навуковай рабоце і выдавецкай дзейнасці:**

— Кніга друкаваная не знікае, толькі пераходзіць у іншую іпастась. Яна застаецца артэфактам, які, у адрозненне ад лічбавай інфармацыі, захоўваецца на працягу дзесяцігоддзяў і нават стагоддзяў. Беларусы — у пэўнай ступені нацыя кніг. Кніжная спадчына для нас — частка гістарычнай памяці, якую, я абсалютна згодны з Уладзімірам Ліхадзедавым, мы павінны захоўваць у тым ліку праз дакументальныя артэфакты. У нашай бібліятэцы работа па захаванні кніжных помнікаў і камплектаванні фондаў наладжана даволі сістэмна. Нешта мы купляем у прыватных уладальнікаў, калекцыянераў; вельмі прыемна, што Уладзімір Ліхадзедаў, як альтруіст, перадае нямала каштоўных дакументаў — старадрукаў, картаў, рэдкіх выданняў XIX—XX стагоддзяў — у фонды Нацыянальнай бібліятэкі, як на дэпазіт (часовае экспанаванне), так і назаўжды. Такая практыка яшчэ рэдкая і прынцыпова новая, у выніку яе ў фондах Нацыянальнай бібліятэкі створаны асобны фонд Уладзіміра Аляксеевіча Ліхадзедава, які пастаянна папаўняецца. Акрамя таго, за апошнія два гады мы сумесна зладзілі, па-мойму, пяць выставак — гэта была практычна выставачная эстафета нон-стоп, і спадзяюся, што супрацоўніцтва працягнецца. Сярод найбольш перспектыўных яго кірункаў назаву далейшае фарміраванне калекцыі, вяртанне кніжных помнікаў, якія дрэнна або зусім не захаваліся ў Беларусі. Калі ж не ўдаецца прывезці на радзіму каштоўныя кнігі і дакументы ў арыгінале, нават на часовае экспанаванне, мы ідзём па шляху электроннага капіравання — у такім выглядзе дакументы дасяжныя для вывучэння шырокім колам даследчыкаў, гісторыкаў.

**Сяргей АЗАРОНАК, дырэктар Дзяржаўнага музея ваеннай гісторыі Беларусі:**

— Кнігі — насамрэч летапісцы гісторыі, тут можна згадаць мноства яскравых прыкладаў, ад «Слова аб палку Ігаравым» да, на жаль, не надта пакуль вядомай сярод моладзі кнігі Семяновіча «Вялікае мастацтва артылерыі» — мяне, як чалавека ваеннага, бярэ гонар за землякоў, працу якіх ацанілі і вывучалі не толькі сучаснікі, але і паслядоўнікі, у тым ліку Пётр І, Напалеон... Гэтаксама я ганаруся, што мы першыя сярод музейшчыкаў падхапілі праект «У пошуках страчанага» і таксама пачалі папулярызаваць яго, паказваць дзецям і падлеткам родную краіну і яе гісторыю з розных бакоў... Хачу падкрэсліць, што сабраныя Уладзімірам Ліхадзедавым калекцыі і артэфакты, якія ён часта бескарысліва перадае розным інстанцыям, адкрываюць шырокія магчымасці для патрыятычнага выхавання. Таму, безумоўна, мы будзем працягваць сумесную работу і не толькі расказваць пра тое, які мы, беларусы, таленантны, добры і шчыры народ, але і паказваць вытокі гераізму беларусаў, шматлікія прыклады мужнасці і самаахвярнасці — арганізуем цыкл выставак пра Айчынную вайну 1812 года, Першую сусветную вайну і, безумоўна, да 75-годдзя Перамогі — пра Вялікую Айчынную вайну.

**Уладзімір Ліхадзедаў:**

*— Ужо праведзена вялікая работа ў гэтым кірунку, гатовыя прыехаць каля 50 калекцыянераў з Расіі, Украіны, Польшчы, Літвы і іншых краін, прывезці ўнікальныя матэрыялы, перадаць шэраг каштоўных матэрыялаў ад усіх нас музеям і бібліятэкам Беларусі. Хацелася б зрабіць гэта апафеозам вышэйзгаданага выставачнага праекта — любыя ідэі і ўдзельнікі вітаюцца, каб толькі гэта не было фармальна, для галачкі, а насамрэч стала падарункам для нашай краіны да 75-годдзя Перамогі.*

**Павел САПОЦЬКА, дырэктар Нацыянальнага гістарычнага музея Беларусі:**

— Перачытваю назву нашага круглага стала і згадваю словы вядомага рэжысёра Уладзіміра Арлова: «Пацалункі высахнуць, абдымкі расцісну́цца, каньякі вып'юцца, цукеркі з'ядуцца, сувеніры перадаруцца, кубкі пакрыюцца пылам, фатаграфіі забудуцца, кнігі — застануцца»... Праект Уладзіміра Ліхадзедава «У пошуках страчанага» — насамрэч унікальная з'ява, я сам збіраю ўсе выданні, як у кнігах, так і ў перыёдыцы. У тым, што праект унікальны, маглі пераканацца і наведвальнікі нашага музея — разам з Уладзімірам Аляксеевічам мы зладзілі некалькі выставак, аналагаў якім дагэтуль не было. Таксама ён перадаў нашаму музею ў дар цікавыя экспанаты, за што мы яму вельмі ўдзячныя. Наш музей таксама імкнецца больш папулярызаваць сябе праз кнігавыданне — летась мы падрыхтавалі дзясятак выданняў: гэта і зборнікі справаздач, і альбомы, і каталогі, і энцыклапедыі — напрыклад, у межах Мінскай міжнароднай кніжнай выстаўкі-кірмашу мы прэзентуем вельмі цікавае выданне, прысвечанае беларускім графікам 1920—1930 гадоў, і кніга абяцае быць насамрэч унікальнай.

**Аляксандр ХРАМЫ, дырэктар дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа:**

— Разам з Уладзімірам Аляксеевічам да юбілею музея Якуба Коласа ў снежні мы прадставілі неардынарны праект — «Ад Адама да Кастуся» — і паказалі праз творчасць Якуба Коласа, як ён захапляўся Адамам Міцкевічам і як іх творы, напісаныя ў розныя эпохі і на розных мовах, былі аб'яднаныя беларускай душой, любоўю да роднай зямлі. Сёлета будзе адзначацца 75 гадоў Вялікай Перамогі. Здавалася б, пры чым тут музей Якуба Коласа? Але варта помніць, што сын Якуба Коласа загінуў падчас Вялікай Айчыннай і што самы ўзростaвы салдат, удзельнік дзвюх войнаў дзед Талаш стаў героем твора Якуба Коласа — мы знайшлі праўнука дзеда Талаша, падрыхтавалі вельмі цікавыя матэрыялы... А з дапамогай Уладзіміра Аляксеевіча Ліхадзедава адшукалі ўнікальныя здымкі, як выглядалі мясціны, звязаныя з жыццём і творчасцю Коласа, — вачыма самога пісьменніка. Таму, вяртаючыся да тэмы нашай дыскусіі — ці карыстаюцца сёння папулярнасцю дакументальныя кнігі, — я лічу, што так, карыстаюцца. Бо, чытаючы любую кнігу, важна не толькі мець сваё ўяўленне пра яе герояў і месца падзей, але і паглядзець, наколькі гэта супадае з тым, як іх паказвалі фатографы, мастакі, сучаснікі гэтых падзей.

**Алена ДРАПКО,**
**Вікторыя ЗАХАРАВА.**

# Чарга ў ціры і трэнажоры пасля 22.00

## Для наведвальнасці — зручны рэжым работы

Паслугі фізкультурна-аздараўленчага цэнтра карыстаюцца асаблівай папулярнасцю летам, але цэнтр не пустуе і зімой. Бегавыя дарожкі вакол стадыёна ў добрую снежную зіму ператвараюцца ў лыжню, тэнісны корт становіцца лядовай пляцоўкай, у гэты час там з'яўляюцца дадатковыя борцікі. А вось што карыстаецца папулярнасцю круглы год, дык гэта вулічныя трэнажоры. Яны знаходзяцца пад навесам, да кожнага з іх прадугледжана інструкцыя.

— Мы пачыналі заняткі ў мясцовым ФАЦ са скандынаўскай хады, хадзілі ў сасновы лес, што непадалёк. Потым дадалі яшчэ і заняткі на трэнажорах, якія з'явіліся тут у 2018 годзе. Цяпер прыходзім на заняткі з сяброўкай два разы на дзень, — расказвае **пенсіянерка Наталля КАПЦЭВІЧ.** — Рэгулярна бачым, што тут займаюцца і дзеці, і падлеткі. Комплекс трэнажораў — гэта вялікі падарунак жыхарам горада ад райвыканкама, — дадае жанчына.

Акрамя гэтага фізкультурна-аздараўленчы цэнтр



Аляксандр БАЦЫЛЁЎ.

мае цір, праводзіць заняткі па шашках і шахматах, а таксама дае магчымасць пагуляць у настольны тэніс. Сёння за ФАЦ замацавана 11 інструктараў-метадыстаў, якія аздараўліваюць насельніцтва, чацвёра з іх працуюць на вёсцы.

— Наша задача аздараўляць, а не займацца прафесійным спортам, — расказвае **дырэктар фізкультурна-аздараўленчага цэнтра Віктар НЕДАЛІЎКА.** — Мы не дзелім гараджан па ўзросту, займаюцца ўсе, хто хоча. Калі некалькі гадоў назіраўся спад у адносінах да папулярнасці фізкультуры, то сёння гэтая тэндэнцыя мяняецца, і мы наадварот бачым павелічэнне патоку людзей.

Напрыклад, групы дзяцей, якія займаюцца стральбой у мясцовым ціры, перапоўненыя, расказвае **інструктар па стральбе Аляксандр БАЦЫЛЁЎ.** «Але я ж не магу іх выгнаць, калі дзеці прыходзяць на заняткі з жаданнем і зацікаўленасцю», — разводзіць рукамі Аляксандр Мікалаевіч. Тут хлопцы і дзяўчаты страляюць з пнеўматычнай зброі, а потым некаторыя з іх дэманструюць свае навыкі на вядомым у краіне турніры «Снежны снайпер».



Віктар НЕДАЛІЎКА.

Большасць наведвальнікаў збіраецца ў самым спартыўным месцы горада бліжэй да вечара, хоць цэнтр працуе з 6 раніцы да 23.00.

— Напэўна, не ўсе ФАЦ у краіне працуюць па такім графіку, але я не магу зачыніць вароты нашай тэрыторыі, калі чалавек хоча займацца ў 22.00, калі яму так зручна, — дзеліцца Віктар Аляксандравіч. — Бо некаторыя прыходзяць на трэнажоры менавіта пасля таго, як сцямнее, таму што саромеюцца. Мы падыходзім да іх, прапануем дапамогу інструктара — адмаўляюцца. Ну, хай лепш займаюцца так, чым наогул ніяк.

## Найлепшыя на спартакіядзе сярод школьнікаў

У цэнтры таксама працуе пракат лыж, канькоў і катамаранаў, а вось палкі для скандынаўскай хады, напрыклад, работнікі гатовыя выдаваць жадаючым бясплатна.

— Група па гэтаму віду спорту з'явілася ў нас у канцы 2018 года, я сам хадзіў і расклейваў аб'явы на прыпынках транспарту ў горадзе, каля буйных крам, таму што для пажылога насельніцтва гэта больш эфектыўна, чым аб'явы ў інтэрнэце, — расказвае дырэктар ФАЦ. — Народ стаў падцягвацца. Сёння яны ўжо проста прыходзяць, бяруць палкі і ходзяць не толькі па нашай тэрыторыі, але і па ўсім горадзе.

Штогод на базе цэнтра праходзяць розныя спартакіяды для мясцовых арганізацый і школ. Дарэчы, Старыя Дарогі ў спартакіядзе сярод школьнікаў у групе В (гарады з невялікім насельніцтвам) ужо чацвёрты год запар займаюць першае месца. Да актыўнага ладу жыцця работнікі ФАЦ імкнуцца прыцягваць цэлыя сем'і, таму праводзяць і вядомую спартакіяду «Мама, тата, я — спартыўная сям'я». Сям'я са Старых Дарог у 2018 годзе выйшла ў фінальную частку рэспубліканскіх спаборніцтваў і ў складзе дружыны Мінскай вобласці заняла трэцяе месца ў краіне.

На стадыёне ФАЦ у чэмпіянаце Мінскай вобласці гуляе аматарская футбольная каманда горада, за якую выступаюць мясцовыя жыхары і студэнты, некаторыя з іх спецыяльна для гэтага вяртаюцца ў родны горад. На гульні старадаражан рэгулярна збіраецца каля сотні балельшчыкаў, што нядрэнна для невялікага горада. Віктар Недаліўка адзначае, калі б у горадзе была хоць адна прафесійная спартыўная каманда, гэта прыцягнула б яшчэ больш насельніцтва да актыўнага ладу жыцця. «У Старых Дарогах раней была футбольная каманда «Будаўнік», дарэчы, за яе гуляў цяперашні намеснік кіраўніка Федэрацыі футбола Юрый Вяргейчык. Калі ў маленькіх гарадках ёсць такія каманды, гэта прыцягвае дзяцей да прафесійных заняткаў спортам, матывуе, ды і ў цэлым папулярызуе фізкультуру. Спорт — гэта відовішча, якое падабаецца людзям».

Летась старадарожскі райвыканкам сумесна з Беларускай федэрацыяй футбола адкрыў новае поле для міні-футбола на базе адной са школ горада, у планах ёсць жаданне стварыць там жа і хакейную каробку. Акрамя фізкультурна-аздараўленчага цэнтра ў горадзе ёсць дзіцяча-юнацкая



спартыўная школа, у ёй займаецца 234 чалавекі. Там адкрыты аддзяленні барацьбы, валейбола і футбола. Сёння ў Старых Дарогах не хапае толькі аднаго — басейна. У горадзе яго ніколі не было, аднак будаўніцтва такога аб'екта ўжо запланавана.

## Многае вырашаюць кадры

Сам Віктар Недаліўка прыехаў у Старыя Дарогі, на радзіму жонкі, з Мінска пасля завяршэння сваёй спартыўнай кар'еры. Будучы паспяховым гандбалістам, ён пагуляў у мінскім «Дынама» і «Вікторыі-Рэгіі», быў найлепшым бамбардзірам чэмпіянату Беларусі.

— Я скончыў сваю кар'еру даволі рана, пяць гадоў таму. Тыя, з кім выступаў, — Барыс Пухоўскі, Дзмітрый Нікуленкаў, Сяргей Шыловіч — сёння яшчэ гуляюць. На той момант у беларускім гандболе наступіў фінансавы крызіс, быў варыянт пераехаць за мяжу, але ў мяне ўжо было двое дзяцей, таму я не захацеў пераязджаць. З'явілася магчымасць працаваць трэнерам па гандболе ў Старых Дарогах, пагадзіўся, таму што хварэю спортам. Набраў хлапчукоў не толькі з горада, але і з вёсак. Яны ў мяне выступалі даволі добра, займалі прызавыя месцы, — расказвае Віктар.

А пасля трох гадоў працы трэнерам яму прапанавалі ўзначаліць фізкультурна-аздараўленчы цэнтр, на той момант пасады кіраўніка і трэнера сумяшчаць было немагчыма, таму аддзяленне гандбола ў старадарожскім ДЮСШ зачынілі. Хоць дарослая аматарская каманда там ёсць і цяпер.

— Мы гуляем у чэмпіянаце Мінскай вобласці, занялі там у апошні раз 4-е месца, — з гонарам адзначае Віктар Аляксандравіч.

Кіраўнік старадарожскага ФАЦ кажа, што атрыманы за багатую гульнявую кар'еру вопыт, вядома, дапамагае ў рабоце і цяпер. Аб сваім пераездзе ў Старыя Дарогі з Мінска ён не шкадуе.

На пытанне пра крытыку з нагоды вялікай колькасці спартыўных аб'ектаў, якія будуюцца ў краіне, Віктар Недаліўка адказвае катэгарычна:

— Калі будуюцца спартыўныя аб'екты, значыць, гэта трэба насельніцтву. Важна рабіць сістэмы зніжак для тых людзей, якія ў іх маюць патрэбу. Мы часта гаворым пра тое, што людзі ў вёсках п'юць, а вось якраз прыцягненне іх і дзяцей з такіх сем'яў да фізкультуры і спорту дапамагае змагацца з гэтай хваробай. У нашым раёне ёсць такія вёскі, як Шапчыцы, Оршаль, Залужжа, дзеці адтуль прыязджаюць да нас на трэніроўкі з вялікім жаданнем. У горад дабіраюцца на школьным аўтобусе, калі ёсць жаданне, ні тры, ні 12 км не палохаюць. Ёсць дзеці і з праблемных сем'яў, вядома, ім лепш чымсьці заняцца, каб ставіць у жыцці мэты і дасягаць іх. З уласнага досведу работы трэнерам яшчэ скажу, што вельмі многае залежыць ад кадраў. Дзяцей трэба заахвоціць, зматываваць, прапанаваць цікавыя трэніроўкі.

**Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.**

*Мінск — Старыя Дарогі — Мінск.*

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

---

Тэніс

# ФІНАЛ АБО ШАНЦ НА ВЫЛЕТ

## Заўтра зборная Беларусі ўступае ў барацьбу Кубка Федэрацыі



**Нашы дзяўчаты ўжо адправіліся ў Гаагу, дзе 7 і 8 лютага выйдуць на крыты грунтавы корт «Sportcampus Zuiderpark». У барацьбе за пуцёўку ў фінальны раўнд найбуйнейшага каманднага турніру ў жаночым тэнісе беларускі сустрэнуцца са зборнай Нідэрландаў. Той, хто прайграе, будзе змагацца за права застацца ў элітнай групе Кубка Федэрацыі.**

За беларускую каманду ў Нідэрландах выступяць Арына Сабаленка, Аляксандра Сасновіч, Вольга Гаварцова і Лідзія Сямёнава. Капітан беларускай зборнай Таццяна Пучак перад вылетам у Гаагу запэўніла, што яе каманда гатовая да гульні, усе здаровыя і знаходзяцца ў добрай форме. У матчы не зможа прыняць удзел Вікторыя Азаранка, хоць першапачаткова яна і дала згоду на сваю прысутнасць у складзе, але з-за сямейнай сітуацыі спартсменка пакуль не можа пакідаць межы ЗША.

Зборная Нідэрландаў прымае ўдзел у Кубку Федэрацыі з самага першага розыгрышу турніру ў 1963 годзе. На яе рахунку 108 перамог пры 74 паражэннях, 36 сезонаў у Сусветнай групе і два фіналы ў 1968 і 1997 гадах. У пачатку нулявых у камандзе адбылася змена пакаленняў, у выніку чаго зборнай прыйшлося пайсці на паніжэнне і доўгі час выступаць у I групе Еўра-Афрыканскай зоны. Вяртанне ў эліту пачалося з прыходам цяперашняга капітана Пола Хархайса, які ў дадзены момант узначальвае яшчэ і мужчынскую зборную ў Кубку Дэвіса.

У складзе зборнай Нідэрландаў значыцца Кікі Бертэнс, Аранча Рус, Леслі Керхоў, Індзі дэ Фрооме і Дэмі Схюрс.

«Фаварыткамі гэтай сустрэчы я лічу галандак. Яны гуляюць дома і на грунце, хоць я і не назвала б пакрыццё вырашальным фактарам. З іншага боку, у нас ужо ёсць вопыт гульні супраць гэтай каманды, мы іх перамагалі, так што ў выніку шанцы можна дзяліць папалам», — адзначыла Таццяна Пучак.

Зборная Беларусі прымае ўдзел у розыгрышы турніру з 1994 года. За гэты час нашы тэнісісткі правялі 102 міжнародныя паядынкі, атрымаўшы 71 перамогу пры 31 паражэнні. Іх найлепшым вынікам з'яўляецца выхад у фінал у сезоне 2017 года. Матч са зборнай Нідэрландаў адкрые для нас чацвёрты сезон запар у эліце сусветнага тэніса.

Нагадаем, што сёлета падапечныя Таццяны Пучак сталі паўфіналісткамі Кубка Федэрацыі, абыграўшы на выездзе зборную Германіі (4:0), а затым ва ўпартай барацьбе зноў у гасцях саступіўшы саперніцам з Аўстраліі (2:3). На дадзены момант беларуская зборная займае 5-е месца сярод 105 удзельніц Кубка Федэрацыі.

Гісторыя асабістых сустрэч зборных Нідэрландаў і Беларусі налічвае чатыры паядынкі, у якіх тры перамогі дасталіся падданым Каралеўства, а адна, самая апошняя на дадзены момант, засталася за беларускамі. Нагадаем, што ў 2017 годзе менавіта дамашнім матчам з Нідэрландамі мы адкрылі для сябе Сусветную групу.

Фінальная частка спаборніцтваў Кубка Федэрацыі сёлета пройдзе 9—14 красавіка ў Будапешце.

**Матэрыялы падрыхтавала Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**



Нефармат

# ПАНІ ТРОШКІ Ў ГАДАХ

Студзень ачомаўся, што ён зімовы месяц, і ў апошні свой дзень ушанаваў Брэст снегападам. Праўда, не надоўга. Дзве гадзіны снег ішоў, а праз дзве наступныя яго не стала, растаў і сплыў. Гэтым снегападам нетыповы студзень нібы выбачаўся, сорамна стала, няёмка, што папярэднія 30 дзён так нахабна «касіў» пад вясну.

А вось яна, здаецца, не адчувае няёмкасці. Я пра жанчыну, якую на прыпынку сустрэла пад тым самым моцным снегападам. Яна захінала сваё прыгожае, але караткаватае паліто, а калені ў лёгкіх панчошках, здаецца, ссінелі ад холаду і слоты. Часам так не па надвор'і ўбіраюцца маладыя дзяўчаты, праўда, цяпер усё радзей. Даўно прыкмячаю яе на сваім прыпынку, відаць, у адзін час едзем на працу. І пра сябе называю яе кабетай, якая з усіх сілаў маладзіцца. Не, яна дагледжаная, фігура ў парадку, апранаецца стыльна. Але ж, як казала адна з маіх даўніх калег, інтэлігентка ў трэцім пакаленні Тамара Сяргееўна: «Даўжыня спадніцы павінна ўсё ж адпавядаць узросту». Асабліва, калі ўзрост за пяцьдзясят.

От, скажуць некаторыя прасунутыя модніцы, бурчыць, нібы бабулька на лаўцы ля пад'езда. Вунь Мая Плісецкая ледзь не ў дзевяноста апраналася ў ласіны. Правільна, Мая Міхайлаўна нацягвала ласіны і спалучала іх з доўгім жакетам. Вялікая балерына з яе бездакорнай фігурай і бездакорным густам у любым узросце выклікала захапленне. І тут, заўважце, ключавое слова «густ». Бо сёння няма перашкод у выбары адзення, стылю, накірункаў моды, ды і практычна няма розніцы паміж уборамі ўзростаў. І ўжо нікога не здзіўляе, калі 60-гадовыя дамы надзяваюць шапкі з пампонамі, а раней гэта было прэрагатывай паненак піянерска-камсамольскага ўзросту. Але ж у тым і фішка, што апрануцца трэба так, каб не выклікаць шкадаванне, няёмкасць у навакольных. Вось пра што я кажу.

Думаю, і калені можна паказаць, калі яны прыгожыя, як гэта ўмела робіць 70-гадовая эстрадная прыма, і здаецца, у яе нядрэнна атрымліваецца. А вось у іншых не заўсёды. Ну калі, выбачайце, жывот навісае над джынсамі, то варта ўсё ж прыкрыць яго даўжэйшым кардыганам ці жакетам, а то будзеш выглядаць не маладой, як хацелася б, а трохі дурнаватай. Так можа падасца навакольным. Як у тым кліпе-смяшынцы, што не так даўно гуляў па інтэрнэце. Там кабета пенсійнага ўзросту, сабрала валасы ў хвост, начапіла бант і вымавіла нешта накшталт «Адчуваю сябе на васямнаццаць, але ж нікому не дакажаш, халера!»

Яно, вядома, нікому не хочацца старэць, а душа, кажуць, не мае ўзросту. І ўнутры, мусіць, ніхто не пачувае сябе на свае гады. Тым больш, што цяпер многія жанчыны сочаць за сабой, вядуць здаровы лад жыцця і не выглядаюць так, як значыцца ў пашпарце. Навокал цяпер рэкламуюць мадэль Крысці Брынклі. Ну ёсць за што! У свае 60 з невялікім хвосцікам выглядае на 30. Сапраўды, вытанчаная фігура, прыгожая скура, галівудская ўсмешка. Тым больш калі на гэтую фігуру жыццё пакладзена, а для маладосці твару ў сучаснай медыцыны ёсць многа сродкаў. На адным з сайтаў мяне зачапіў яе здымак, дзе супермадэль гульліва, паказаўшы нагу з-пад разрэзу скураной спаднічкі, з дзіцяча-гарэзлівым выразам твару дэманструе часопіс з уласным здымкам, трымаючы яго ў руцэ. А рука... сухая з вытыркаючымі сасудамі, нібы ў старой-старой бабулькі. На руках скуру не падцягваюць пакуль. Думаю, гэта справа будучыні. Але і зноў непрыемны асадак, нібы шкадаванне. Хоць там і напісана, што мадэль толькі што звяла хлопца ў маладой галівудскай актрысы. Відаць, тыя хлопцы на рукі не зважаюць, ва ўсялякім разе не ўсе з іх.

Як і паклоннікі нашых былых эстрадных і тэлезорак. Нядаўна зноў успаміналі пра хуткае вяселле 77-гадовай Ангеліны Воўк з маладзейшым на 25 гадоў чалавекам. Ну, не яна першая, не яна апошняя. Ці даўно абмяркоўвалі сямейнае жыццё Лідзіі Федасеевай-Шукшынай з Алібасавым? Ёсць і іншыя прыклады. Здаецца, Макрону ўдалося ўвесь свет пераканаць, што ён шчасліва са сваёй пажылой Брыжыт. Усё бывае на гэтым свеце.

Дык пра што гэта я? А пра тое, што і насіць можна што заўгодна, і раманы круціць з кім хочаш, але... Цяпер вось пайшоў шквал фільмаў, тэатральных пастановак пра тое, што людзі і пасля 60 маюць права на жыццё, пачуцці, памылкі. Але нядаўна паглядзела перадачу пра Стэфанію Станюту. І яшчэ раз зразумела, што прыцягвала ўсіх навакольных у гэтай жанчыне — высокае пачуццё ўласнай годнасці, якое арганічна было звязана з паводзінамі, учынкамі, адносінамі да людзей, знешнім выглядам. Па-мойму, пералічанае найбольш здольнае ўпрыгожыць жанчыну, калі яна дасягае ўзросту, які Рыгор Барадулін выразіў словамі «пані трошкі ў гадах».

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

## СЁННЯ

### Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 8.48 | 17.59 | 9.11 |
| Віцебск — | 8.42 | 17.45 | 9.03 |
| Магілёў — | 8.38 | 17.50 | 9.12 |
| Гомель — | 8.30 | 17.51 | 9.21 |
| Гродна — | 9.03 | 18.15 | 9.12 |
| Брэст — | 8.58 | 18.21 | 9.23 |

### Месяц

*Першая квадра 2 лютага. Месяц у сузор'і Рака.*

### Імяніны

***Пр.** Ксеніі, Герасіма, Івана, Мікалая, Цімафея. **К.** Аманды, Дароты, Багдана, Ціта.*




Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЗАЎТРА




## УСМІХНЕМСЯ

Аб'ява:

«Прадам вясельную сукенку.

Шчаслівая!

Пяць разоў выходзіла ў ёй замуж, і заўсёды удала!»

**— Фіма, пры тваёй зарплаце мы ніколі не дагонім суседзяў. Іх ужо ў трэці раз абрабавалі, а нас яшчэ ні разу.**

Жаночы бокс, жаночы хакей і яшчэ тры спосабаў сказаць: «Ну які ж ты бязрукі, дай я сама!»

**Усё жыццё авечка ваўкоў баялася, а з'еў яе пастух (каўказская прымаўка).**




Даты | Падзеі | Людзі

**6 ЛЮТАГА**

У краіне

**1800** год — нарадзіўся Ігнат Рыгоравіч Кулакоўскі, беларускі грамадскі дзеяч, асветнік, педагог. Быў грамадскім супрацоўнікам Віленскага музея старажытнасцяў, сябрам Віленскай археалагічнай камісіі, сябрам навуковых таварыстваў у Вільні, Варшаве, Пецярбургу, Даніі. Прыцягнуў да сябе ўвагу вышэйшых улад і навуковых колаў сваім зваротам у Дэпартамент народнай асветы Расіі аб выкладанні гісторыі Беларусі ў вучылішчах і стварэнні спецыяльных падручнікаў для беларускага юнацтва. Пераконваў у неабходнасці вывучэння мовы беларускага народа, яго этнаграфіі, мастацтва.

**1875** год — нарадзіўся Марцін Кухта, друкар, выдавец кніг на беларускай мове. У 1906-м заснаваў у Вільні друкарню з правам выдаваць кнігі на ўсіх еўрапейскіх мовах. Друкаваў творы Францішака Багушэвіча, Максіма Багдановіча, Якуба Коласа, Цёткі і іншых беларускіх пісьменнікаў, этнаграфічныя матэрыялы, календары, зборнікі, ноты з беларускімі песнямі і танцамі.



**1945** год — нарадзіўся Барыс Юстынавіч Норман, беларускі мовазнаўца, доктар філалагічных навук (1984), прафесар (1985), заслужаны работнік адукацыі Беларусі (2001). Аўтар навуковых даследаванняў у галіне агульнага, славянскага і рускага мовазнаўства.

**1995** год — падпісаны дагаворы паміж Рэспублікай Беларусь і Літоўскай Рэспублікай — аб добрасуседстве і супрацоўніцтве, аб беларуска-літоўскай дзяржаўнай мяжы.

У свеце

**1900** год — Аляксандр Папоў і Пётр Рыбкін усталявалі першую ў свеце рэгулярна дзеючую лінію радыёсувязі на адлегласць 50 км паміж востравам Гогланд і горадам Котка (падтрымлівалася да красавіка 1900-га). Прыборы Папова былі ўжытыя для сувязі падчас работ па ліквідацыі аварыі браняносца «Генерал-адмірал Апраксін» каля вострава Гогланд і пры выратаванні рыбакоў, вынесеных на крыэе ў мора. Марское міністэрства палічыла вопыт устаноўкі радыёсувязі пераканаўчым і дало ўказанне аб увядзенні бяздротавага тэлеграфа на суднах флоту.

**1930** год — у Маскве адкрыўся Цэнтральны тэатр Чырвонай Арміі (цяпер — Цэнтральны акадэмічны тэатр Расійскай Арміі).



**1945** год — нарадзіўся Боб Марлі (поўнае імя Роберт Неста Марлі), папулярны ямайскі спявак, музыкант, стваральнік стылю рэгі. Яго імя было пасмяротна ўнесена ў Залу славы рок-н-рола.

**1945** год — у Лондане адбылася І Сусветная канферэнцыя прафсаюзаў. Прынята рашэнне аб утварэнні Сусветнай федэрацыі прафсаюзаў.

**1950** год — упершыню ў СССР на серыйным знішчальніку МІГ-17 перавышана хуткасць гуку ў гарызантальным палёце.

**1960** год — нарадзіўся Ігар Ігаравіч Мацвіенка, расійскі кампазітар, прадзюсар, стваральнік гурта «Любэ», заслужаны дзеяч мастацтваў Расійскай Федэрацыі.

**1985** год — пастановай ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР быў утвораны Навукова-даследчы інстытут касмічнага прыборабудавання.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс);
аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі — 287 18 81.

прыём рэкламы тэл./факс: 287 17 79,
e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 373.

Нумар падпісаны ў 19.30 5 лютага 2020 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12